Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 196 5570)
ЧАЦВЕР
27
ЖНІЎНЯ
1936 г.
Год выдання XX

ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ У НУМАРЫ:

Прывітанне таварыша Сталіна лётчыку-выпрабавальніку тав. В. Кокінакі.

Пісьмо лётчыка В. Кокінакі таварышу Сталіну.

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларускай ССР — Аб скліканні XII надзвычайнага з'езда Советаў Беларускай ССР і аб парадку выбараў і скліканні з'ездаў Советаў на мясцах.

Г. Дзімітраў — Абараняць подлых тэрарыстаў — значыць дапамагаць фашызму.

ПЕРАДАВЫЯ АРТЫКУЛЫ: Вышэй званне члена партыі; Па-большэвіцку працаваць з пісьмамі працоўных.

Прыгавор суда над трацкісцка-зіноўеўскай бандай аднадушна ўхваляюць працоўныя Совецкай Беларусі.

Парушэнне граніцы СССР японскімі самалётамі.

ЛЁТЧЫКУ-ВЫПРАБАВАЛЬНІКУ ТАВАРЫШУ КОКІНАКІ

Віншую Вас с дасягненнем новага высотнага рэкорду. Моцна паціскаю Вам руку.

І. СТАЛІН.

Пісьмо лётчыка В. Кокінакі таварышу Сталіну

ДАРАГІ ІОСІФ ВІСАРЫЁНАВІЧ!

Да глыбіні душы ўзрушан Вашымі бацькоўскімі клопатамі. Цяжка падабраць словы, каб выказаць пачуццё падзякі Вам за пастаянную, штодзенную ўвагу да маёй скромнай работы.

Вам, Іосіф Вісарыёнавіч, штодзень прыходзіцца займацца сотнямі пытанняў дзяржаўнага маштабу і тым не менш Вы не забываеце аб нашых дробных справах, сочыце за нашай работай, натхняеце нас на заваяванне новых перамог, якія праслаўляюць нашу авіяцыю, нашу вялікую радзіму.

Бацька наш, друг наш, настаўнік наш, калі адчуваеш, што Вы сочыце за нашымі невялікімі справамі, работа вельмі добра спорыцца, працаваць лёгка і радасна і думаецца, што няма такіх крэпасцяў у стратасферы, якіх мы не маглі-б узяць.

Сёння я яшчэ раз хачу сказаць Вам, любімы, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, што я не спынюся на дасягнутым, не зазнаюся, а буду старанна з дня ў дзень павышаць дасягнутую мною столь, удасканальваць тэхніку высотных палётаў і перадаваць яе сваім калегам.

Лётчык-выпрабавальнік

В. КОКІНАКІ.

26 жніўня 1936 г.

ВЫШЭЙ ЗВАННЕ ЧЛЕНА ПАРТЫІ!

Пад кіраўніцтвам партыі і вялікага **Сталіна** пабудавана сацыялістычнае грамадства на адной шостай частцы свету.

Гэтыя перамогі атрыманы ў выніку жорсткай барацьбы з класавымі ворагамі, у барацьбе з усякімі апартуністамі, права-левацкімі элементамі, контррэвалюцыйнымі трацкістамі, зіноўеўцамі, якія з'яўляюцца перадавым атрадам міжнароднай контррэвалюцыі, сталі актыўнымі агентамі фашысцкіх атрадаў.

Кожны рабочы і калгаснік нашай вялікай радзімы добра разумее, што дасягнутым поспехам наша краіна, рабочы клас, калгаснае сялянства і ўвесь працоўны народ абавязаны комуністычнай партыі і вялікім геніям чалавецтва **Леніну** і **Сталіну.**

У пачатку XX века, у змрочныя гады панавання самадзяржаўя, **Ленін** і **Сталін** пачалі будаваць новую партыю — партыю новага тыпу, «партыю баявую, партыю рэвалюцыйную, дастаткова смелую для таго, каб павесці пролетарыяў на барацьбу за ўладу, дастаткова вопытную для таго, каб разабрацца ў складаных умовах рэвалюцыйнай абстаноўкі, і дастаткова гібкую для таго, каб абыйсці ўсе і ўсякія падводныя камені на шляху да мэты» (**Сталін:** «Пытанні ленінізма»).

У жорсткай барацьбе з усялякімі ворагамі рабочага класа — эканамістамі, рэвізіяністамі, меншавікамі, эсэрамі, трацкістамі-зіноўеўцамі, якія ператварыліся ў борзых псоў фашысцкіх ахранак, — Ленін і Сталін стварылі нашу вялікую комуністычную партыю, правялі яе праз горан рэвалюцыі 1905 года, гады рэакцыі, імперыялістычнай вайны і вывелі партыю на шырокую дарогу сацыялістычнай рэвалюцыі і будаўніцтва сацыялізма.

Любоўна і ўважліва, як самы клапатлівы садоўнік, **Ленін** і **Сталін** даглядалі, выхоўвалі нашу партыю.

«У рэзультаце непрымірымай барацьбы з усімі ворагамі рэвалюцыі, дзякуючы ленінска-сталінскай арганізацыйнай палітыцы, партыя стварыла ў сябе ўнутранае адзінства, здзіўляючую згуртаванасць і выхавала комуністаў у духу жалезнай дысцыпліны і рэвалюцыйнай пільнасці. Гэтыя якасці — закон большэвізма». (**«Правда»**).

Комуністычная партыя, партыя, створаная і выпеставаная **Леніным** і **Сталіным,** з'яўляецца авангардам рабочага класа. Яна ўключае ў сябе лепшых з лепшых прадстаўнікоў рабочага класа, людзей, да канца адданых справе комунізма, справе сусветнай пролетарскай рэвалюцыі.

«Мы, комуністы, — вучыць нас таварыш **Сталін,** — людзі асобага складу. Мы скроены з асобага матэрыялу. Мы — тыя, якія складаем армію вялікага пролетарскага стратэга, армію таварыша **Леніна.** Які гонар належаць да гэтай арміі! Няма нічога вышэйшага, як званне члена партыі, заснавальнікам і кіраўніком якой з'яўляецца таварыш **Ленін.** Не ўсякаму дана быць членам такой партыі. Не ўсякаму дана вытрымаць няўзгоды і буры, звязаныя з членствам у такой партыі».

Праведзеныя па прамой ініцыятыве таварыша **Сталіна** праверка партыйных дакументаў, а следам за гэтым і абмен партыйных дакументаў з'явіліся велізарнейшай важнасці арганізацыйна-палітычным мерапрыемствам, яшчэ больш умацаваўшым рады ВКП(б).

Важнейшым рэзультатам праверкі і абмену партыйных дакументаў з'яўляецца тое, што партыйныя арганізацыі адначасова з выкрыццём і выгнаннем з партыі варожых людзей — двурушнікаў, трацкістаў, нацдэмаў, прарабілі вялікую работу па прывядзенню ў парадак партыйнай гаспадаркі.

Партыйныя арганізацыі пачалі лепш вывучаць людзей і працаваць з імі.

Гэта яшчэ больш узмацніла адзінства і маналітнасць радоў партыі.

Партыя наша зараз моцна і маналітна, як ніколі.

Партыя акружана шматмільённым народам Совецкага Саюза, які бачыць у партыі свайго адзінага кіраўніка. Совецкі народ бязмежна любіць свайго правадыра — роднага, любімага вялікага **Сталіна.** Ён згуртаваўся вакол яго. Ён гатоў аддаць сваё жыццё за справу партыі, за справу **Леніна—Сталіна,** за справу сацыялізма.

Вораг разбіт. Але сям-там засталіся яго прадстаўнікі, якія двурушнічаюць, ашукваюць, пераафарбоўваючыся, стараюцца пралезці ў рады нашай партыі і прыкрываючыся партыйным білетам, шкодзіць нам.

Працэс над трацкісцка-зіноўеўскай фашысцкай шайкай, што скончыўся, дае кожнаму комуністу, кожнаму партыйнаму і непартыйнаму большэвіку прадметны ўрок класавай барацьбы.

Двурушнічаючы, ашукваючы партыю, прабуючы сваімі дэкламацыямі ўсыпіць большэвіцкую пільнасць,— гэта ашалелая зграя сабак рыхтавала ўдар супроць правадыроў партыі і ўрада, супроць вялікага Сталіна.

Нам трэба моцна памятаць, што там, дзе большэвіцкая пільнасць не знаходзіцца на належнай вышыні, там, дзе званне члена партыі не захоўваецца ў чыстаце, там лягчэй чым дзе ўдаецца ворагам прыкрыцца партыйным білетам і тварыць сваю контррэвалюцыйную работу.

Пасля абмену партыйных дакументаў у радзе пярвічных партыйных арганізацый выкрыты заядлыя ворагі партыі, якія так маскаваліся, што ім удалося атрымаць новыя партыйныя дакументы. Факты з партарганізацый рэдакцыі «Звязды», ВКСГШ, Швэйтрэста, КІЖа, Белкаапсаюза і інш. ярка гэта пацвярджаюць.

Абмеркаванне на гарадскіх і раённых партыйных актывах, у пярвічных партыйных арганізацыях рашэння бюро ЦК КП(б)Б па партарганізацыі рэдакцыі газеты «Звязда», перадавых артыкулаў цэнтральнага органа нашай партыі, газеты «Правда», а таксама дэтальнае вывучэнне матэрыялаў працэсу над главарамі трацкісцка-зіноўеўскай банды, безумоўна яшчэ больш узнялі актыўнасць партарганізацый, узнялі і павысілі пільнасць.

Партарганізацыі выкрываюць прытаіўшыхся сям-там і хаваючых свой подлы твар трацкістаў-зіноўеўцаў.

Але гэта не азначае, што ў радах КП(б)Б не засталіся яшчэ побач з замаскаванымі трацкістамі — ратазеі, балбатуны, благадушныя чынушы, якія сваёй абыякавасцю, адсутнасцю большэвіцкай пільнасці адкрываюць граніцы партыі, даюць магчымасць беспакарана працаваць ворагам. Нямала яшчэ ў нас і лібералаў, якія іграюць у фальшывую дэмакратыю там, дзе патрэбна з усёй большэвіцкай рашучасцю і настойлівасцю выкарчоўваць ворага да канца.

Комуніст павінен перш за ўсё ўладаць рэвалюцыйнай пільнасцю.

«Патрэбна, каб ва ўсёй штодзеннай рабоце комуніста спадарожнічала большэвіцкая, чэсная, благародная, унутраная трывога за справу партыі, каб ён умеў своечасова распазнаваць ворага, у якую бы тогу ён ні апранаўся. Кожны комуніст павінен імкнуцца працаваць і жыць так, як вучыў нас **Ленін,** як вучыць нас таварыш **Сталін.** Кожны комуніст павінен быць дастойным сынам вялікай партыі **Леніна—Сталіна,** дастойным высокага звання члена партыі».

24 жніўня ў Маскве на Тушынскім аэрадроме Цэнтральнага аэраклуба СССР адбылося авіяцыйнае свята, прысвечанае Дню авіяцыі. На здымку: на трыбуне (злева направа) тт. Андрэеў, Л. М. Кагановіч, Орджанікідзе, Чубар і інш. наглядаюць за палётамі спартыўных самалётаў.
Фото Кіслова (Саюзфото).

Аб скліканні XII надзвычайнага з'езда Советаў Беларускай ССР і аб парадку выбараў і скліканні з'ездаў Советаў на мясцах

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Беларускай ССР

У адпаведнасці з пастановай ЦВК Саюза ССР ад 2 жніўня 1936 года аб VIII з'ездзе Советаў Саюза ССР і аб парадку выбараў і скліканні з'ездаў Советаў на мясцах —**Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларускай ССР пастанаўляе:**

1. XII усебеларускі з'езд Советаў склікаць 20 лістапада 1936 года ў горадзе Менску.

2. Лічыць XII з'езд Советаў Беларускай ССР надзвычайным.

3. Выбары на раённыя з'езды Советаў праводзіць ад існуючых пленумаў гарадскіх, сельскіх і пасялковых Советаў.

4. Пленумы гарадскіх, сельскіх і пасялковых Советаў для выбараў дэпутатаў на раённыя з'езды Советаў праводзіць з 1 па 20 кастрычніка 1936 года.

5. Раённыя з'езды Советаў і пленумы самастойных горсоветаў склікаць у перыяд паміж 20 кастрычніка і 5 лістапада 1936 года.

6. У адпаведнасці з пастановай VII з'езда Советаў Саюза ССР і пастановай ЦВК Саюза ССР ад 2 жніўня 1936 г. органаў улады, як правіла, не перавыбіраць.

7. Падцвердзіць поўнамоцтвы Цэнтральнай Выбарчай Камісіі пры Прэзідыуме ЦВК БССР.

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар ЦВК БССР М. ЛЯЎКОЎ.

26 жніўня 1936 г.
г. Менск.

Аб невыкананні дырэктыў партыі і ўрада аб уборцы і абмалоце канюшыны

Пастанова ўпаўнаважанага КСК СНК СССР па Беларускай ССР

Праверкай устаноўлена, што старшыня Дрыбінскага райвыканкома тав. Клімаў, дырэктар МТС т. Клімовіч, старшыня Багушэўскага райвыканкома т. Еўдасееў, дырэктар МТС т. Галавёнак, старшыня Смалявіцкага райвыканкома тав. Хадаркевіч, загадчык райза т. Нішчык і дырэктар МТС т. Басалыга безадказна аднесліся і не выконваюць дырэктыў партыі і ўрада аб уборцы канюшыны на працягу 7—10 дзён і абмалоту яе за 20 дзён з дня ўборкі.

Насеннікі канюшыны, не гледзячы на поўнае паспяванне, поўнасцю не ўбраны, скошаная канюшына не вяжацца ў снапы і не адвозіцца ў крытыя такі, а пакідаецца на полі, што выклікае велізарныя страты насення канюшыны. Замест таго, каб арганізаваць абмалот канюшыны адначасова з зернавымі, да моманту праверкі КСК у раёнах да абмалоту канюшыны не прыступалі. Дырэктар Дрыбінскай МТС т. Клімовіч нават не меў даных, колькі ён павінен абмалаціць канюшыны.

Наркамзем БССР уборкай і абмалотам канюшыны кіруе слаба. Начальнік зернавога кіраўніцтва тав. Лабзакоў, адказны за канюшыну, пусціў на самацёк уборку і абмалот канюшыны. Па БССР да 15 жніўня абмалочана канюшыны разам з аднагадовымі травамі ўсяго толькі 14 проц.

Старшыні Дрыбінскага райвыканкома т. Клімаву, не забяспечыўшаму своечасовай уборкі і абмалоту канюшыны ў раёне — абвясціць вымову.

Дырэктару Дрыбінскай МТС т. Клімовічу, не прыняўшаму ніякіх мер да абмалоту канюшыны малатарнямі МТС — абвясціць суровую вымову.

Загадчыку Смалявіцкім райзямаддзелам т. Нішчыку за бяздзейнасць па арганізацыі ўборкі і абмалоту канюшыны — абвясціць суровую вымову.

Прыняць да ведама заяўлені старшынь Багушэўскага і Смалявіцкага райвыканкомаў тт. Еўдасеева і Хадаркевіча і дырэктароў МТС Галавенка і Басалыга, што яны абавязуюцца закончыць абмалот канюшыны да 1 верасня.

Папярэдзіць іх, што ў выпадку нясвоечасовага абмалоту канюшыны — яны будуць прыцягнуты да стражэйшай адказнасці.

Адзначыць зусім нецярпімыя адносіны Наркамзема БССР да справы арганізацыі ўборкі і абмалоту канюшыны.

Указаць начальніку зернавога кіраўніцтва Наркамзема Беларусі тав. Лабзакову на слабае кіраўніцтва і кантроль за ходам уборкі і абмалоту канюшыны. Прапанаваць Наркамзему БССР тав. Бенеку неадкладна знішчыць выяўленыя праверкай недахопы, забяспечыць уборку і абмалот канюшыны ва ўстаноўленыя ўрадам тэрміны і аб прынятых мерах паведаміць да 1 верасня.

Упаўнаважаны КСК пры СНК СССР па Беларускай ССР
А. ЦІХОН.

ПАРУШЭННЕ ГРАНІЦЫ СССР ЯПОНСКІМІ САМАЛЁТАМІ

ХАБАРАЎСК, 25 жніўня (БЕЛТА). За апошні час адзначаецца вялікая колькасць парушэнняў граніцы СССР японскімі самалётамі. Толькі за перыяд часу паміж 14 і 23 жніўня гэтага года адзначана 5 выпадкаў залёту японскіх самалётаў з тэрыторыі Манчжоу-Го на тэрыторыю СССР.

14 жніўня, у 11 гадзін 50 мінут, японскі аднаматорны самалёт тыпу «Разведчык» на вышыні 1.500 метраў пераляцеў граніцу ў пункце, размешчаным за 6 клм. на паўднёвы ўсход ад паселішча Саньфэнькэ. Самалёт паглыбіўся на тэрыторыю СССР на 6 клм. і, узяўшы курс на поўнач, праляцеў над тэрыторыяй СССР да гары Пасадніца, адкуль павярнуў на захад. У 12 гадзін 05 мінут самалёт вылецеў на манчжурскую тэрыторыю.

16 жніўня, у 12 гадзін 05 мінут, японскі самалёт тыпу «Разведчык» на вышыні 500 метраў пераляцеў граніцу ў пункце, што знаходзіцца за два кілометры на паўднёвы захад ад заставы імя Кацельнікава, адкуль, павярнуўшы на поўнач, праляцеў над нашай тэрыторыяй каля чатырох кілометраў.

17 жніўня, у 11 гадзін 55 мінут, японскі самалёт тыпу «Разведчык» парушыў граніцу ў пункце, які знаходзіцца за 6 клм. на поўдзень ад Сіянхэ; за 7,5 клм. на паўднёвы ўсход ад Сіянхэ самалёт павярнуў у напрамку да Манчжурыі, дзе і знік.

17 жніўня, у 12 гадзін 30 мінут, японскі самалёт тыпу «Разведчык» парушыў дзяржаўную граніцу СССР каля падзі «Марожаная» (4 клм. на паўночны захад ад паселішча Вінакурка —раён возера Ханка). Самалёт паглыбіўся на 600 мтр. над тэрыторыяй СССР і прайшоў каля 1 клм. курсам на поўнач, знікшы на манчжурскай тэрыторыі ў напрамку г. Баньцзэхе.

23 жніўня меў месца новы выпадак парушэння граніцы СССР. На гэты раз ужо два японскія самалёты ў раёне пагранічнага знака № 22 паглыбіліся на тэрыторыю СССР на 15 клм. У раёне пагранічнага знака № 23 самалёты вылецелі на манчжурскую тэрыторыю.

Паводле вестак, якія ёсць тут, паўпрэдству СССР у Токіо і генеральнаму консулу СССР у Харбіне даручала заявіць пратэсты супроць гэтых незаконных пералётаў японскіх самалётаў праз граніцу СССР.

ВАЕННА-ФАШЫСЦКІ МЯЦЕЖ У ІСПАНІІ

ЛОНДАН, 25 жніўня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, там раскрыт «камітэт сувязі з мяцежнікамі», які займаўся тым, што паведамляў мяцежнікам аб дзеяннях іспанскага ўрада і аб перасоўваннях войск. Камітэт меў тайную радыёстанцыю. Усе члены камітэта арыштаваны. У Мадрыдзе створан асобы трыбунал у складзе трох суддзяў і 14 прадстаўнікоў рабочых арганізацый для разбору спраў, звязаных з мяцяжом.

МАДРЫД. 26 жніўня. (БЕЛТА). У Мадрыдзе функцыянуе і бесперапынна засядае асобы трыбунал, створаны ўрадам у адпаведнасці з воляй шырокіх мас насельніцтва для суда над асобамі, якія замяшаны ў фашысцкім мяцяжу.

У склад трыбунала ўваходзяць побач з трыма ўрадавымі суддзямі, 14 народных суддзяў, якія прадстаўляюць усе партыі і арганізацыі народнага фронту, у тым ліку два прадстаўнікі комуністычнай партыі.

4 афіцэры прыгавораны трыбуналам да кары смерцю; учора прыгавор прыведзен у выкананне.

Народныя трыбуналы створаны і ў іншых месцах Іспаніі і ўжо прыступілі да разгляду спраў, у прыватнасці, у Малазе, у адпаведнасці з прыгаворам народнага трыбунала, пакараны смерцю 21 мяцежнік.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ ПРАЦАВАЦЬ З ПІСЬМАМІ ПРАЦОЎНЫХ

Усе народы нашай краіны з велізарнейшай актыўнасцю, гордасцю і радасцю абмяркоўваюць праект сталінскай Канстытуцыі, якая азначае нябачаны росквіт совецкай дэмакратыі.

Совецкі чалавек, грамадзянін самай свабоднай краіны ў свеце, патрыёт сваёй радзімы, зацікаўлены тым, каб дзяржаўныя ўстановы, гаспадарчыя, профсаюзныя і іншыя арганізацыі працавалі дакладна, без бюракратычных скажэнняў. Ён патрабуе чулага, хуткага рэагавання на скаргі, якія ён падае.

Чула, уважліва прыслухоўвацца і рэагаваць на скаргі і просьбы працоўных — вось чаму нястомна вучыў нас Владзімір Ільіч **Ленін,** вось чаму вучыць нас правадыр народаў таварыш **Сталін.**

Ад большэвіцкага друку, які з'яўляецца «адзінай зброяй, пры дапамозе якой партыя штодзенна, штогадзінна гаворыць з рабочым класам на сваёй, патрэбнай ёй, мове»; ад работнікаў газет у першую чаргу патрабуюцца асабліва чулыя адносіны да скаргаў, пісем і сігналаў працоўных. Без гэтага немагчыма сувязь з масамі, без гэтага немагчыма разгортваць большэвіцкую крытыку і самакрытыку.

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б «Аб рабоце газет **«Звязда», «Рабочий», «Віцебскі пролетарый», «Комунар Магілеўшчыны»** і **«Калгаснік Talачыншчыны»** з пісьмамі працоўных», змешчаная 24 жніўня ў нашай газеце, паказвае, што далёка не ўсе гаркомы, райкомы КП(б)Б і газеты, у тым ліку і наша газета, не зрабілі належных вывадаў з рашэння ЦК ВКП(б) ад 20 сакавіка 1936 г. «Аб рабоце газет «Северо-Кавказский большевик» і «Звезда» (Перм) з пісьмамі працоўных». Абмежаваўшыся фармальнай прапрацоўкай гэтага важнейшага палітычнага дакумента, газеты, і ў першую чаргу «Звязда», не забяспечылі сапраўднага, карэннага палепшання работы з пісьмамі працоўных. Больш таго: у практыцы работы дапушчаны грубыя скажэнні дырэктыў партыі па гэтаму пытанню.

Учот паступаючых пісем пастаўлен ва ўказаных у пастанове ЦК КП(б)Б газетах яўна нездавальняюча. Нямала выпадкаў, калі пісьмы месяцамі ляжаць у рэдакцыях без усякага руху, губляюцца, здаюцца ў архіў без расследвання і рэагавання. Сярод пісем, зданых у архіў, нямала такіх, якія сігналізуюць аб буйнейшых недахопах у рабоце розных арганізацый.

Газеты не сочаць за тым, каб скаргі працоўных, дасланыя на расследванне ці на рэагаванне, разбіраліся па сутнасці.

Яны не праяўляюць патрэбнай большэвіцкай настойлівасці ў тым, каб ні адна скарга, ні адзін доніс не застаўся без канкрэтнага адказу, без сапраўднага выпраўлення недахопаў, указаных у пісьмах працоўных. Толькі гэтым тлумачыцца той факт, што сотні пісем і скаргаў, дасланых розным арганізацыям, застаюцца без усякага рэагавання. **Клічаўскія** раённыя арганізацыі не адказалі рэдакцыі «Звязда» на пасланыя ім 102 пісьмы, **даманавіцкія** раённыя арганізацыі—на 97 пісем, **рэчыцкія** — на 87, **дубровенскія** — на 85, **талачынскія** — на 83 пісьмы. Рабочыя, калгаснікі, якія прыслалі сваю скаргу ў рэдакцыю, на працягу некалькіх месяцаў і нават больш не атрымалі адказу па сутнасці сваіх скаргаў.

Нямала ў нас яшчэ бюракратаў, якія, замест таго, каб прыслухоўвацца ўважліва да голасу мас, да іх сігналаў, займаюцца фармальнай адпіскай, топяць жывую справу ў моры паперамарання. Вось, напрыклад, загадчык жлобінскага райза Піскуноў атрымаў сур'ёзнейшы сігнал аб непарадках у калгасе «Вясёлая Асінавіца», аб разбазарванні калгаснай маемасці. Ён гэта пісьмо перасылае пракурору. Пракурор у сваю чаргу перасылае пісьмо зноў у райза, і так на працягу больш месяца гэта пісьмо перасылаецца з райза ў пракуратуру і назад, а злоўжыванні ў калгасе прадаўжаюцца. Або ўзяць такі факт. Рэдакцыя накіроўвае скаргу грамадзяніна Кабанава пракурору горада Гомеля. Ён, не разабраўшыся па сутнасці ў скарзе, перасылае яе пракурору Добрушскага раёна, а той у сваю чаргу перасылае яе ў рэдакцыю з прапановай пераслаць скаргу ў нарсуд гор. Гомеля. Атрымалася гэта таму, што пракурор горада Гомеля па-барску, па-чыноўніцку фармальна аднёсся да скаргі гр. Кабанава.

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб рабоце газет з пісьмамі ўскладае прамую адказнасць на гаркомы і райкомы партыі за становішча работы газеты з пісьмамі. Партарганізацыі абавязаны забяспечыць выкананне дырэктыў партыі аб тым, каб у газетах, ва ўстановах і гаспадарчых арганізацыях праяўлялася максімум увагі і клопатаў да жывых людзей, да іх пісем і скаргаў, каб гэта справа не перадаручалася другарадным работнікам, гэтай справай павінен займацца сам кіраўнік установы.

Працэс трацкісцка-зіноўеўскага тэрарыстычнага цэнтра яшчэ раз паказаў, што вораг лёгка пралазіць у нашы арганізацыі там, дзе слабая пільнасць, дзе слабая сувязь з шырокімі масамі працоўных.

Вышэй рэвалюцыйную пільнасць! — вось вывад, які робіць увесь совецкі народ з толькі што скончанага працэсу. Узмацненне рэвалюцыйнай пільнасці цяснейшым чынам звязана з разгортваннем большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі. Суровая большэвіцкая самакрытыка, не зважаючы на асобы, дапаможа нам працаваць лепш, дапаможа выкрыць усіх ворагаў і здраднікаў нашай радзімы.

Вось чаму патрабуюцца ўважлівыя, чулыя адносіны да малейшага сігналу, да скаргі працоўнага ад усіх газет і арганізацый, ад усіх работнікаў нашых устаноў, дзяржаўных і гаспадарчых арганізацый.

Партыя не пацерпіць бюракратаў, людзей, якія не бачаць за пісьмом і скаргай, паступаючымі ў газету, жывога чалавека, грамадзяніна самай свабоднай ў свеце Совецкай краіны.

ВУЧЭННІ ПА ПРОЦІПАВЕТРАНАЙ АБАРОНЕ МЕНСКА

ПЕРШЫ НАЛЕТ „ВОРАГА“

26 жніўня... Горад у пагражаючым становішчы... Горад напагатове і чакае «нападу».

Раптам у 16 гадзін чуецца трывожнае выццё сірэн. Па радыё было абвешчана аб паветраным нападзе. Насельніцтва сталіцы арганізавана сустрэла першы налёт.

Быстра апусцелі вуліцы. Спыніліся трамваі, аўтамашыны, зачыніліся дзверы магазінаў. Толькі вартавыя, надзеўшы процігазы, засталіся на сваіх пастах.

Першыя свае «ўдары», як і трэба было чакаць, «праціўнік» накіраваў на галоўныя аб'екты горада— чыгуначны вузел, буйнейшыя фабрыкі і заводы.

На склады швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» «праціўнік» кінуў запальваючую бомбу. Пажарная каманда пачала ліквідацыю «пажару». Але вораг падпаліў таксама побач стаячы будынак. Начальнік пажарнай аховы тав. Марошка разгубіўся і не мог зараз-жа прыняць правільнае рашэнне, у выніку — будынак «згарэў»...

Следам за запальваючымі бомбамі вораг кінуў хімічныя бомбы. Дан сігнал: — «Газы!» Зараз-жа хімічныя каманды, апранутыя ў процігазы і процііпрытныя касцюмы, інтэнсіўна пачалі дэгазацыю месц паражэння.

Ні на секунду не спынілася работа ў цэхах. Каля 800 рабочых, майстры і абслугоўваючы персанал другой змены надзелі процігазы і прадаўжалі работу. Байцы санітарнай каманды падбіралі і выносілі ў абмывачны пункт і пункт першай медыцынскай дапамогі «раненых» і «атручаных» рабочых. Начальнік абмывачнага пункту, ордэнаноска тав. Цяпліцкая аддае дакладныя распараджэнні, сочыць за аказаннем патрэбнай дапамогі.

⁂

На завод імя «Кірава» «вораг» скінуў 12 хімічных, фугасных і запальваючых бомб. Узніклі два «пажары», якія хутка былі ліквідаваны і была атручана частка заводскага двара. 70 рабочых атрымалі частковае «атручанне» газамі і некаторыя з іх — «раненні». Усе «пацярпеўшыя» былі накіраваны ў больніцу.

⁂

... Першы налёт «ворага» быў з поспехам адбіт, канчаткова ліквідаваны сляды паражэння. Але працоўныя сталіцы нашай ордэнаноснай БССР павінны памятаць, што «праціўнік» у любую мінуту можа паўтарыць свой налёт.

Горад павінен быць гатоў адбіць і наступны напад.

Н. ВІШНЕЎСКІ,
Н. ГАСМАН.

У апошнюю гадзіну

Новае прызначэнне Буліта

ВАШЫНГТОН. Рузвельт абвясціў аб прызначэнні пасла ЗША ў СССР Буліта паслом у Францыі замест Страуса, які вышаў у адстаўку па хваробе. Рузвельт пакуль не абвясціў аб прызначэнні новага пасла ЗША ў Совецкі Саюз. Буліт да ўступлення ў абавязкі пасла ЗША ў Францыі застаецца паслом ЗША ў СССР.

ПАМЯЦІ
СЕРГЕЯ СЕРГЕЕВІЧА КАМЕНЕВА

Чырвоная Армія з глыбокім болем сустрэне паведамленне аб заўчаснай смерці аднаго з старэйшых і заслужаных сваіх байцоў і камандзіраў — камандарма 1-га ранга Сергея Сергеевіча Каменева.

Кадравы афіцэр старай арміі, палкоўнік генеральнага штаба—Сергей Сергеевіч з першых дзён Октябрскай рэволюцыі без хістанняў і назаўсёды стаў пад сцягамі Вялікай Пролетарскай рэволюцыі, поўнасцю аддаючы маладой Чырвонай Арміі свае вялікія сцяті і ваенны вопыт.

Імя Сергея Сергеевіча, глаўнакамандуючага ў дні грамадзянскай вайны, трывала ўвайшло ў гісторыю нашай барацьбы з белагвардзейшчынай і інтэрвенцыяй.

За свае выдатныя заслугі ў грамадзянскай вайне Сергей Сергеевіч быў узнагароджан вышэйшай баявой узнагародай — ордэнам Чырвонага Сцяга, баявой зброяй і радам іншых узнагарод.

Па сканчэнні грамадзянскай вайны Сергей Сергеевіч з уласцівай яму энергіяй, нястомна прадаўжаў працаваць над умацаваннем баявой магутнасці любімай ім Чырвонай Арміі. Займаючы паслядоўна рад адказных пасад — Інспектара РСЧА, начальніка штаба РСЧА, начальніка Галоўнага ўпраўлення РСЧА, намесніка старшыні Рэўваенсовета СССР і, нарэшце, пасаду начальніка супроцьпаветранай абароны краіны,— Сергей Сергеевіч нязменна ўкладываў у сваю работу ўсё свае гарачае сэрца, свой яркі розум.

Не гледзячы на сваю велізарную службовую загружанасць, Сергей Сергеевіч адначасова вёў і шырокую грамадскую работу. Ён у свой час актыўна кіраваў першымі мерапрыемствамі Совецкай улады і грамадскасці па асваенню Арктыкі. Ён адзін з старэйшых членаў і стваральнікаў Асоавіяхіма — масавага абарончага таварыства. У Асоавіяхіме Сергей Сергеевіч, як грамадскі работнік, кіраваў масавым стралковым спортам. Ён любоўна вырасціў цэлае пакаленне майстэрскіх стралкоў і снайпераў.

Сваёй рабоце Сергей Сергеевіч заўсёды аддаваўся поўнасцю, да канца, з усёй палкасцю свайго вялікага і чэснага сэрца. Ён хварэў, у поўным сэнсе гэтага слова, за даручаемую яму справу. Так іменна працаваў ён і на сваім апошнім службовым пасту, выконваючы вельмі адказную і вельмі патрэбную работу па ўмацаванню проціпаветранай абароны сваёй радзімы.

Усяго некалькі дзён таму назад, як заўсёды нястомны, бадзёры, поўны сіл і энергіі, Сергей Сергеевіч кіраваў у Ленінградзе проціпаветраным вучэннем. Тым астрэй боль утраты. Ніяк не хоча мірыцца розум з тым, што гэтага выдатнага байца, арганізатара і камандзіра Чырвонай Арміі, чулага і сардэчнага таварыша няма ўжо сярод нас, што так раптоўна і так рана, усяго на 56-м годзе, абарвалася гэтае прыгожае жыццё—жыццё сумленнага сына нашай Вялікай радзімы.

Сергей Сергеевіч памёр большэвіком, членам нашай партыі. Фармальна членам нашай партыі ён стаў 6 год таму назад. Але яшчэ задоўга да гэтага, у дні цяжкіх выпрабаванняў грамадзянскай вайны,—ён моцна і беспаваротна звязаў свой лёс з партыяй, з вялікай справай Леніна—Сталіна. Ён чэсна і аддана служыў Вялікай Пролетарскай рэволюцыі.

Краіна Советаў умее цаніць такіх людзей, як Сергей Сергеевіч. Памяць аб ім, як аб слаўным баявым камандзіры і чэсным сыне сваёй радзімы, назаўсёды застанецца ў сэрцах байцоў Пролетарскай рэволюцыі.

Варашылаў К. Е., Орджанікідзе Г. К., Гамарнік, Тухачэўскі, Бубноў, Уншліхт, Егораў, Будзённы, Блюхер, Убарэвіч, Шапашнікаў, Белоў, Арлоў, Віктараў, Муклевіч, Алксніс, Халепскі, Левандоўскі, Дыбенка, Кашырын, Федзько, Дубавы. Корк, Галлэр, Кожанаў, Седзякін, Булін, Амелін, Осепян. Аронштам, Веклічаў, Грышын, Гугін, Грыбаў. Гарбачоў, Эйдэман, Пецін, Межэнінаў, Левічоў, Грязноў. Гайліт, Гаркавы, Веліканаў, Шыфрэс, Смірноў, Славін, Окунеў. Мезіс. Іппо, Гарадавікоў, Куцякоў, Берзін, Сангурскі. Цімошэнка, Фельдман, Урыцкі, Ефімаў, Шэстакоў. Ярцэў, Ястрэбоў, Хрыпін, Тадорскі, Апанасенка, Аппога, Васіленка, Германовіч, Лапін. Лудры, Пракоф'еў, Рагоўскі, Фішман. Хрулеў, Кулік, Кучынскі. Баранаў, Нікольскі, Гарф, Перамытаў. Вольпе, Бокіс, Блажэвіч. Лонгва, Бэрдоўскі, Косіч. Жыльцоў, Петухоў, Хмельніцкі. Авіновіцкі, Смолін, Пугачоў, Ошлей. Нікіцін, Ланда, Трояккер, Ульрых, Смародзінаў.

АБ ПАХАВАННІ КАМАНДАРМА 1-га РАНГА КАМЕНЕВА С. С.

Урад зацвердзіў камісію па арганізацыі пахавання камандарма 1-га ранга Каменева С. С. у складзе тт. Уншліхта (старшыня), Тухачэўскага, Осепяна, Эйдэмана Фельдмана, Усова.

Пахаванне С. С. Каменева прынята за кошт дзяржавы.

Аб выдачы дзяржаўнай дапамогі шматсямейным

Совет Народных Камісараў БССР на пасяджэнні 25 жніўня 1936 года разгледзеў прадстаўленыя праз аддзел актаў грамадзянскага стану (ЗАГС) НКУС БССР заявы шматсямейных мацярэй па дзесяці раёнах (па г. Менску і Менскаму раёну, Віцебскаму, Гомельскаму, Бабруйскаму, Бярэзінскаму, Плешчаніцкаму, Парыцкаму, Аршанскаму, Петрыкаўскаму і Кіраўскаму раёнах) і пастанавіў выплаціць 74 шматсямейным мацерам дзяржаўныя дапамогі ў адпаведнасці з пастановай ЦВК і СНК СССР ад 27 чэрвеня 1936 года.

Многія мацеры атрымаюць па 4 і па 6 тысяч рублёў.

Напрыклад, Скуратовіч М. Г., якая мае 8 дзяцей, атрымае у гэтым годзе 4 тыс. рублёў. Коган С. А., якая мае 8 дзяцей, атрымае ў гэтым годзе таксама 4 тыс. рублёў. Стукач А. С., якая мае 9 дзяцей, атрымае ў гэтым годзе 6 тыс. рублёў.

СНК БССР прапанаваў аддзелу актаў грамадзянскага стану НКУС СССР шырока паведаміць насельніцтва аб прыёме заяў ад шматсямейных і паскорыць іх прадстаўленне на вырашэнне ў СНК БССР.

ВЫКАНАННЕ ПЛАНА ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАННЯ КАЛГАСАЎ ПА БССР І ВЫДАЧЫ ДЗЯРЖАЎНЫХ АКТАЎ НА І ЖНІЎНЯ 1936 ГОДА

Дзяржаўныя акты на вечнае карыстанне зямлёй выданы 4.745 сельскагаспадарчым арцелям (49,9 проц. плана).

Палявыя землеўпарадчыя работы завершаны ў 7.502 калгасах — 77,5 проц. плана выдачы дзяржаўных актаў.

Раённымі выканаўчымі камітэтамі зацверджаны землеўпарадчыя праекты для 5.513 калгасаў — 57 проц. плана выдачы дзяржаўных актаў.

Раёны	Старшыя землеўпарадчыкі райза	Выкананы палявыя землеўпарад. работы ў проц. да агульн. ліку калгасаў	Зацверджана РВК праектаў у проц. да агульн. ліку калгасаў	Выдана дзярж. актаў у проц. да агульн. ліку калгасаў
Віцебскі	Ермашэнка	100,0	100,0	100,0
Лепельскі	Кажэўнікаў	100,0	100,0	100,0
Гарадоцкі	Зарэцкі	100,0	100,0	100,0
Крычаўскі	Маханек	100,0	100,0	100,0
Уздзенскі	Елінскі	100,0	100,0	100,0
Заслаўскі	Калмановіч	100,0	100,0	100,0
Старадарожскі	Сямёнаў	100,0	100,0	100,0
Дубровенскі	Канановіч	100,0	100,0	93,8
Горацкі	Зайцаў	100,0	100,0	100,0
Лоеўскі	Кучынскі	100,0	100,0	100,0
Б.-Кашалеўскі	Мяцельскі	100,0	100,0	97,4
Капаткевіцкі	Патапейка	100,0	96,6	94,9
Дзяржынскі	Кустаў	100,0	96,8	92,1
Любаньскі	Корбут	100,0	96,2	84,9
Менскі	Баброў	100,0	91,6	91,6
Добрушскі	Драбышэўскі	100,0	93,6	93,6
Уваравіцкі	Кумец-Кулеш	100,0	96,0	94,0
Мсціслаўскі	Белянкоў	100,0	97,4	92,3
Лёзнянскі	Шкуратаў	100,0	84,8	49,7
Ушацкі	Захарэнка	100,0	85,5	47,9
Чашніцкі	Мефоддзяў	100,0	71,6	55,3
Бягомльскі	Трафімовіч	100,0	70,3	70,3
Жлобінскі	Нарковіч	100,0	56,1	46,3
Полацкі	Кудзін	98,6	77,2	77,2
Гомельскі	Пракопенка	98,2	94,7	94,7
Асіпавіцкі	Ліфіц	98,0	84,8	84,8
Плешчаніцкі	Кашнікаў	97,1	88,6	85,7
Бешанковіцкі	Власенка	97,0	68,5	54,8
Дрысенскі	Брэшчанка	96,8	75,2	68,8
Слуцкі	Грушэўскі	96,7	84,6	61,5
Бялыніцкі	Раганькоў	95,5	44,6	33,0
Капыльскі	Богуш	94,4	86,1	73,1
Магілеўскі	Партноў	93,3	86,6	86,6
Ветрынскі	Драбышэўскі	93,3	80,0	76,0
Веткаўскі	Дрэйзін	92,9	35,7	33,3
Лельчыцкі	Сарокін	92,2	70,6	70,6
Асвейскі	Сінякоў	91,6	88,0	85,6
Лагойскі	Віленскі	92,8	76,5	69,4
Смалявіцкі	Лук'янаў	90,9	50,5	46,5
Аршанскі	Зэлікаў	88,6	76,1	69,6
Ч.-Слабодскі	Гінзбург	88,2	56,9	52,9
Мазырскі	Людагоўскі	87,5	55,8	46,2
Рэчыцкі	Зайцаў	87,0	51,9	25,0
Дрыбінскі	Лубяка	86,3	19,9	10,3
Талачынскі	Гваздоў	85,1	72,1	70,6
Журавіцкі	Селюкоў	82,6	42,0	21,7
Шклоўскі	Набойкін	80,6	79,6	57,7
Глускі	Кулак	78,9	14,0	6,1
Чэрыкаўскі	Кухта	77,9	14,7	13,7
Мехаўскі	Кейзер	76,2	41,6	33,7
Цэрахаўскі	Значкоў	73,1	59,0	53,8
Нараўлянскі	Шатун	72,9	34,6	28,4
Ельскі	Зрайцаў	72,3	44,6	44,6
Тураўскі	Мяжэвіч	72,2	27,8	27,8
Свяцілавіцкі	Ягораў	71,1	37,8	11,1
Петрыкаўскі	Пракаповіч	70,5	38,5	38,5
Рагачоўскі	Рабіновіч	70,4	44,4	44,4
Камарынскі	Якаўлеў	69,4	22,2	13,9
Хоцімскі	Панкраценка	69,3	46,6	39,8
Брагінскі	Цімашкоў	68,6	49,5	36,0
Барысаўскі	Гаеўскі	67,5	35,0	26,5
Кармянскі	Бутвіловіч	65,5	22,7	20,9
Чырвонапольскі	Максімаў	64,2	22,0	21,1
Пухавіцкі	Трубянок	63,8	43,6	40,4
Крупскі	Яўменаў	63,7	11,5	6,2
Парыцкі	Новікаў	63,5	27,9	27,9
Касцюковіцкі	Слабікаў	59,4	41,9	27,1
Чачэрскі	Толецкі	58,4	29,2	29,2
Кіраўскі	Грамовіч	58,4	44,8	43,8
Смілавіцкі	Марчанка	57,4	26,4	20,7
Бабруйскі	Шэўчук	57,2	35,5	18,1
Быхаўскі	Аўдзееў	57,1	37,9	25,0
Сіроцінскі	Волкаў	55,7	47,3	12,6
Жыткавіцкі	Бурдынюк	55,6	28,9	22,2
Багушэўскі	Асташонак	55,6	41,9	29,1
Чавускі	Бубель	54,4	49,7	49,7
Халопеніцкі	Луферчык	53,6	11,2	11,2
Клімавіцкі	Інцярэсаў	52,4	14,6	11,6
Старобінскі	Клішэвіч	53,2	29,1	24,0
Прапойскі	Гатоўскі	47,9	23,3	11,0
Чэрвеньскі	Станкевіч	48,0	23,6	23,0
Суражскі	Каралькоў	46,1	29,9	26,9
Расонскі	Купцоў	44,5	26,7	28,1
Сенненскі	Данілаў	45,5	21,6	[illegible]
Клічаўскі	Марозаў	42,0	22,5	[illegible]
Хойніцкі	Адзярыха	41,6	20,2	[illegible]
Грэскі	Гурскі	40,8	19,7	19,7
Круглянскі	Волах	38,8	12,7	10,4
Бярэзінскі	Чарнухін	34,9	9,6	9,6
Даманавіцкі	Шведка	28,4	28,4	26,3

АДДЗЕЛ ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАННЯ І МЕЛІЯРАЦЫІ НКЗБ.

Прыгавор суда над трацкісцка-зіноўеўскай бандай аднадушна ўхваляюць працоўныя Совецкай Беларусі

ГОЛАС НАРОДУ

Працоўныя ўсёй Совецкай Беларусі з найглыбейшым задавальненнем сустрэлі прыгавор Вярхоўнага суда над контррэволюцыйнай трацкісцка-зіноўеўскай тэрарыстычнай бандай забойц.

У рэдакцыю штодзенна паступаюць дзесяткі рэзалюцый мітынгаў і агульных сходаў рабочых, калгаснікаў, часцей Чырвонай арміі, навуковых работнікаў, служачых, настаўнікаў, якія ў адзін голас заяўляюць:

— Суд выказаў волю народу.

— Подлыя найміты фашысцкай ахранкі, найзлейшыя ворагі працоўных—контррэволюцыйная банда трацкістаў-зіноўеўцаў стала на падлейшы шлях тэрору супроць вялікага прадаўжацеля справы **Маркса — Леніна,** геніяльнага правадыра таварыша **Сталіна** і яго баявых саратнікаў.

— Ворагі пралічыліся. Меч пролетарскай дыктатуры — органы НКУС — прыпыніў злачынныя намеранні забойц.

— Пад кіраўніцтвам Леніна — Сталіна наша слаўная Комуністычная партыя прывяла нашу краіну да велізарнейшых у свеце перамог, разграміўшы на сваім шляху ўсіх, хто перашкаджаў пераможнаму соцыялістычнаму будаўніцтву, хто цягнуў нас назад.

Так заяўляюць у сваёй рэзалюцыі настаўнікі Талачынскага раёна, сабраўшыся на раённую канферэнцыю.

—Мы патрабуем ад пракуратуры СССР дасканала расследваць прычаснасць Бухарына, Рыкава, Радэка і іншых да подлай трацкіска-зіноўеўскай банды і да канца разблытаць гэты контррэволюцыйны клубок,— заяўляюць у сваёй рэзалюцыі рабочыя менскага хлебазавода.

— Мы кляймім ганьбай лідэраў II Інтэрнацыянала, якія ўзялі пад абарону гэтых вырадкаў—забойц з трацкісцка-зіноўеўскага цэнтра,— гавораць у сваёй рэзалюцыі рабочыя менскага завода «Чырвоная зара».

— Мы запэўняем партыю і ўрад, што яшчэ больш будзем мацаваць баявую магутнасць нашай Чырвонай арміі, павышаць сваю класавую пільнасць і яшчэ цясней згуртуемся вакол партыі Леніна—Сталіна, — гавораць у сваёй рэзалюцыі байцы, камандзіры і палітработнікі II-скага артылерыйскага палка.

Ва ўсіх рэзалюцыях і выказваннях з вуснаў працоўных не зыходзіць дарагое імя правадыра народаў таварыша **Сталіна.** Сталёвай несакрушальнай сцяной працоўныя Совецкай Беларусі акружаюць любімага і дарагога генія чалавецтва— творца і арганізатара Беларускай Соцыялістычнай Рэспублікі.

У словах любві і адданасці адчуваецца гатоўнасць нашага народу, які пад мудрым кіраўніцтвам таварыша Сталіна атрымаў сваю дзяржаўнасць і будуе шчаслівае, радаснае жыццё—грудзьмі адстаяць жыццё дарагіх правадыроў, вялікага настаўніка народаў **Сталіна.**

— Яшчэ зарчэй вока пагранічнікаў, не дадзім ні адной фашысцкай гадзіне пранікнуць праз нашы свяшчэнныя граніцы.

Такі голас народу Совецкай Беларусі.

БЯЗМЕЖНАЯ АДДАНАСЦЬ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

ОРША, 25 жніўня. Тысячы працоўных горада і вёскі слухалі па радыё прыгавор суда над ашалелай контррэволюцыйнай трацкісцка-зіноўеўскай бандай. Апладысментамі быў ухвален прыгавор.

У часе абедзеных перапынкаў 24 жніўня на мясакамбінаце, хлебакамбінаце, Асінторфе, на чыгунцы адбыліся вялікія мітынгі, на якіх зачытвалася паведамленне аб прыгаворы суда.

— Кожны, хто адважыцца пасягнуць на жыццё нашых правадыроў, хто адважыцца перашкодзіць нам ствараць шчаслівае жыццё, той будзе раздушан, як гадзіна, — заявіў стаханавец Белгрэса тав. Кузняноў.

— Я задаволен прысудам. Больш паганцы не будуць атручваць вольнага паветра нашай шчаслівай краіны, дзе кіруе мудры Сталін,—сказаў калгаснік Мядзвецкі на мітынгу ў калгасе «Большэвік».

У сваіх рэзалюцыях рабочыя і калгаснікі заяўляюць аб сваёй бязмежнай адданасці да партыі і любімага правадыра Сталіна. Яны патрабуюць расследваць сувязі Рыкава, Бухарына, Радэка і іншых з контррэволюцыянерамі трацкістамі і зіноўеўцамі — гэтымі майстрамі подлых крывавых спраў. (БЕЛТА).

З АДАБРЭННЕМ СУСТРЭЛІ ПРЫГАВОР

КРУПКІ, 26. (Па тэлефону). Ва ўсіх калгасах, прамысловых арцелях раёна праведзены мітынгі аб прывядзенні ў выкананне прыгавору над контррэволюцыйнай трацкісцка-зіноўеўскай тэрарыстычнай бандай.

Гэта паведамленне працоўныя раёна сустрэлі з вялікім адабрэннем.

Рабочыя лесапільнага завода, выказваючы сваю вялікую любоў да партыі Леніна—Сталіна, бяруць на сябе абавязацельства яшчэ вышэй падняць прадукцыйнасць працы. Рабочыя шавецкай арцелі абавязаліся да канца 1936 года даць звыш плана на 10 тыс. рублёў прадукцыі.

У сваіх выступленнях рабочыя і калгаснікі выносілі падзяку работнікам НКУС, якія змаглі адвесці акрываўленыя рукі подлых трацкісцка-зіноўеўскіх забойцаў ад самага дарагога, самага каштоўнага для ўсіх працоўных — жыцця таварыша Сталіна.

Раённая канферэнцыя настаўнікаў аднадушна вітала прыгавор Вярхоўнага суда і заявіла:

— Яшчэ цясней згуртуемся вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна і яе геніяльнага кіраўніка таварыша Сталіна.

Будзем ахоўваць сваіх правадыроў, як зяніцу вока

ДЗЯРЖЫНСК, 26 жніўня. З вялікай нецярплівасцю чакалі працоўныя пагранічнай Дзяржыншчыны вынясення прыгавору суда над трацкісцка-зіноўеўскай бандай. Працоўныя Дзяржыншчыны, як і ўвесь 170-мільённы народ Совецкай краіны, патрабавалі вышэйшай кары ворагам партыі і народу.

Клуб соўгаса імя Сталіна перапоўнен. Сюды на мітынг сабраліся ўсе рабочыя і служачыя соўгаса. Паведамленне аб тым, што патрабаванне працоўных выканана — бандыты прысуджаны да расстрэлу — было спаткана бурнымі апладысментамі.

Рабочыя соўгаса Сіўко, Пятроў і інш. у сваіх выступленнях запэўнялі нашу партыю, наш урад, што будуць, як зяніцу вока, ахоўваць жыццё нашых правадыроў.

У прынятай рэзалюцыі рабочых соўгаса «Негарэлае» гаворыцца:

— Мы яшчэ цясней згуртуемся вакол комуністычнай партыі і нашага друга дарагога Сталіна, які вядзе нашу краіну ад адной перамогі да другой.

ВОЛЯ НАРОДУ ВЫКАНАНА

Байцы, камандзіры і палітработнікі Чырвонай арміі разам з усімі працоўнымі вялікай совецкай краіны з асаблівым натхненнем і гордасцю сустрэлі прыгавор пролетарскага суда над шайкай бандытаў з трацкісцка-зіноўеўскага цэнтра.

У часцях Менскага гарнізона праведзены мітынгі, на якіх байцы і камандзіры аднадушна адабраюць і вітаюць прыгавор. Ні адзін найміт фашыста Троцкага не схаваецца, ён будзе раскрыт і знішчан да канца.

Пры атрыманні газет з паведамленнем аб прывядзенні прыгавору ў выкананне быў праведзен мітынг байцоў і начсклада Н-скай часці. Мітынг аднадушна адобрыў прыгавор і паведамленне аб прывядзенні яго ў выкананне.

— Ніякай літасці ворагам народу — гаворыцца ў рэзалюцыі мітынга. — Яшчэ мацней згуртуемся вакол нашай партыі і вялікага Сталіна, вядучага краіну ад перамогі да перамогі.

У сваіх выступленнях на мітынгах байцы і камандзіры аднадушна выказалі сваю думку:

— Прыгавор пролетарскага суда — гэта прыгавор усяго нашага народу. Прывядзеннем прыгавору ў выкананне выканана воля народу. Абязглаўлена шайка подлых забойц, але гэта яшчэ не ўсё. Рэшткі і асколкі контррэволюцыйнага фашысцкага атрэп'я яшчэ будуць шукаць моманту, каб ужаліць, укусіць нас з-за вугла.

Гэта ім не ўдасца. Няма ніякай сілы, якая магла-б процістаяць сіле і магутнасці нашай соцыялістычнай радзімы, нашай Чырвонай арміі.

Мы будзем, як зяніцу вока, берагчы цэласнасць і недатыкальнасць нашай совецкай зямлі, яшчэ больш узмацніўшы класавую пільнасць.

Дык вядзі-ж нас, мудры Іосіф Вісарыёнавіч, да новых і новых перамог, да комуністычнага бяскласавага грамадства.

Ал. ШПІТАЛЬНЫ.

Г. Дзімітраў

АБАРАНЯЦЬ ПОДЛЫХ ТЭРАРЫСТАЎ— ЗНАЧЫЦЬ ДАПАМАГАЦЬ ФАШЫЗМУ

Нельга без пачуцця глыбокага абурэння чытаць тэлеграму, якую афіцыйныя прадстаўнікі Сацыялістычнага Інтэрнацыянала і Міжнароднага аб'яднання профсаюзаў Дэ-Брукер, Адлер, Сітрын і Шэвенельс так хутка накіравалі совецкаму ўраду па поваду суда над тэрарыстычным трацкісцка-зіноўеўскім цэнтрам.

Ці дзейнічалі гэтыя рэакцыйныя лідэры з такой-жа хуткасцю, калі Комуністычны Інтэрнацыянал зварачаўся да Сацыялістычнага Інтэрнацыянала ў мэтах аказання сумеснай дапамогі змагаючымся ў кастрычніку 1934 г. са зброяй у руках астурыйскім гарнякам? Ці спяшаліся яны адказаць на неаднаразовыя звароты прадстаўнікоў Комуністычнага Інтэрнацыянала выступіць сумесна ў абарону абісінскага народу, які падвергнуўся нападу з боку італьянскага фашызма? Нічуць не бывала. Памятаецца, тады яны заявілі, што лічаць сябе не кампетэнтнымі ўступаць у перагаворы па гэтаму пытанню і што патрэбна чакаць скліку Выканкома Сацыялістычнага Інтэрнацыянала. А гутарка-ж ішла тады аб справядлівай, сумленнай справе, аб абароне жыццёвых інтарэсаў не толькі іспанскага, але і ўсяго міжнароднага пролетарыята, аб барацьбе з самай несправядлівай, бясчэснай, захватніцкай вайной.

Цяпер, аднак, яны аказаліся зусім кампетэнтнымі самаасабіста, не пытаючыся свае арганізацыі, браць пад абарону падсудных тэрарыстаў, накіраваўшых сваю злачынную руку супроць кіраўнікоў совецкай улады.

Заўсёды было так. Калі пролетарскі суд у Совецкім Саюзе апускаў свой караючы меч на шкоднікаў, падсыпаўшых бітае шкло ў страву рабочым, атручваўшых калгасную жывёлу, псаваўшых машыннае абсталяванне, на шпіёнаў-дыверсантаў, агентаў фашызма, разбураўшых чыгуначнае палатно, рабіўшых узрывы, — нязменна ў абарону гэтага контррэволюцыйнага атрэп'я выступалі ў якасці хадатаяў такія рэакцыйныя лідэры, як Сітрын, Адлер і інш. Не раз у мінулым, калі органы пролетарскай дыктатуры лавілі з палічным агентаў замежнага фашызма, рыхтуючых замах на правадыроў краіны соцыялізма, спачуванне рэакцыйных лідэраў Другога і Амстэрдамскага інтэрнацыяналаў было не на баку рабочых і калгаснікаў Совецкага Саюза, а на баку іх лютых ворагаў.

Лідэры Сацыялістычнага Інтэрнацыянала не пасылалі тэлеграмы ні ВКП(б), ні совецкаму ўраду з выказваннем спачування, калі здрадніцкі быў забіт лепшы сын народу, самаадданы змагар за справу вызвалення міжнароднага рабочага класа таварыш Кіраў. Наадварот, яны і тады паспяшаліся ўзяць пад абарону тых, на каго абрушыўся народны гнеў. Тым больш абураюча, што іменна зараз, калі вакол гераічна змагаючагася іспанскага народу складаецца на справе адзіны міжнародны фронт барацьбы супроць мяцежных генералаў, супроць германскага і італьянскага фашызма ў абарону рэспублікі і дэмакратыі, Сітрыны і кампанія выступаюць з варожай дэманстрацыяй супроць краіны соцыялізма, самага стойкага, непарушнага аплоту свабоды народаў.

Што могуць сказаць гэтыя адвакаты Троцкага, Зіноўева, Каменева перад тварам неабвержаемых фактаў? Хіба не даказана, што Троцкі, якога рэакцыйныя соцыялістычныя лідэры ў свой час узнімалі на шчыт, з'яўляецца арганізатарам індывідуальнага тэрору ў Совецкім Саюзе? Даказана. Хіба не даказана, што яго саюзнікі — Каменеў, Зіноўеў і інш. падрыхтоўвалі на працягу раду год тэрарыстычныя замахі супроць найвялікшага правадыра і арганізатара перамог соцыялізма таварыша Сталіна, супроць лепшых яго саратнікаў, кіраўнікоў партыі і совецкай улады? Даказана. Хіба не даказана, што гэта тэрарыстычная банда забіла Кірава? Даказана. Хіба не даказана, што подлыя тэрарысты дзейнічалі ў саюзе з Гестапо, г. зн. з тайнай паліцыяй германскага фашызма, самага лютага ворага рабочага класа, зверскага ката комуністычных, соцыялістычных і беспартыйных рабочых? Даказана. Хіба не даказана, што контррэволюцыйныя тэрарысты ў сваім затхлым падполлі культывавалі норавы фашысцкіх ахраннікаў, падпальваўшых рэйхстаг і пасля знішчаўшых удзельнікаў гэтай гнуснай справы? Даказана. Усё гэта было даказана на гласным совецкім судзе, у прысутнасці прадстаўнікоў міжнароднага друку, было пацверджана катэгарычнымі прызнаннямі саміх падсудных. Прыпертыя да сцяны фактамі і ўлікамі, яны поўнасцю прызналі прад'яўленыя ім абвінавачванні і не адмаўлялі сваёй палітычнай арганізацыйнай сувязі з фашызмам.

Хіба не факт, што падсудныя ў сваім апошнім слове адзін за адным заяўлялі аб гнуснасці сваіх злачынстваў перад рабочым класам?

А Сітрын, Адлер і інш. выступілі з іх абаронай

Смешныя і нікчэмныя разважанні гэтых лідэраў аб прадстаўленні абвінавачваемым належачых ім праў. Абвінавачваемым былі даны ўсе магчымасці сказаць тое, што яны хацелі. Ім было прадастаўлена права выбраць абаронцаў, выклікаць сведак, патрабаваць праверкі доказаў і т. д. Але яны адмовіліся ад абароны, ад выкліку якіх-небудзь сведак, ад сваіх абарончых прамоў, бо ланцуг злачынстваў быў вельмі відавочны, вельмі бясспрэчна даказана. Іх злачынствы перад тварам усяго свету на адкрытым працэсе былі даказаны дакументамі, фактамі, рэчавымі доказамі. Злачынныя змоўшчыкі былі злоўлены з палічным, са зброяй у руках, з атрыманымі ад агентаў гітлераўскай ахранкі пашпартамі, з выбуховымі матэрыяламі.

Дакументальна даказана на судзе асабістае кіраўніцтва Троцкага тэрарыстамі, якіх ён пасылаў для забойства Сталіна, для арганізацыі тэрарыстычных актаў супроць кіраўнікоў соцыялістычнай дзяржавы. Доказы ў вінаватасці трацкісцка-зіноўеўскіх тэрарыстаў былі прыведзены больш, чым дастаткова на адкрытым судовым працэсе.

Было ясна даказана, што Троцкі, Зіноўеў, Каменеў і іх банда стаялі па той бок барыкады, стаялі ў адным лагеры з тымі, хто змагаецца супроць іспанскага народу, хто дасылае аэрапланы, ружжы і снарады мяцежным генералам, хто ажыццяўляе контррэволюцыйную інтэрвенцыю ў Іспаніі.

Свае выступленне ў абарону тэрарыстаў — ворагаў совецкай улады — Сітрын і кампанія прабуюць абгрунтаваць спасыланнем на неабходнасць захавання пролетарскай салідарнасці са змагаючымся рабочым класам Іспаніі. Яны прабуюць стварыць уражанне, што суд над контррэволюцыйнымі тэрарыстамі ў СССР пагражае праяўленню гэтай пролетарскай салідарнасці з іспанскім народам. Гэта — заведамая хлусня.

Суд над тэрарыстамі, агентамі фашызма — састаўная частка антыфашысцкай барацьбы міжнароднага рабочага класа. Сапраўдная салідарнасць з іспанскім народам не ўзгадняецца з абаронай агентаў фашызма ў іншых краінах. Нельга падтрымліваць чэсна іспанскі народ, які змагаецца супроць фашызма, і ў той-жа час выступаць абаронцам тэрарыстычнай банды ў СССР, дапамагаючай фашызму. Той, хто прама або ўскосна падтрымлівае контррэволюцыйных тэрарыстаў у СССР, той па сутнасці справы служыць іспанскаму фашызму, той зрывае барацьбу іспанскага народу і аблягчае яго паражэнне.

Выступленне лідэраў Сацыялістычнага Інтэрнацыянала і Міжнароднага аб'яднання профсаюзаў вядзе да падрыву салідарнасці міжнароднага пролетарыята з пролетарыятам СССР. Яно наносіць удар руху адзінства сусветнага рабочага класа. Яно накіравана да зрыву адзінага фронту працоўных супроць фашызма ў Іспаніі, у Францыі і ў іншых краінах. Выступленне Сітрына і іншых ёсць прамы ўдар па гераічнай барацьбе іспанскага народу, бо калі-б іспанскі народ паследваў тым гнілым парадам, якія дазваляюць сабе даваць народам СССР рэакцыйныя соцыялістычныя лідэры, Іспанская рэспубліка асудзіла-б сябе на паражэнне.

Іспанскі народ таму і нясе такія афяры, што контррэволюцыйныя генералы вельмі доўга карысталіся беспакаранасцю, што не былі прадпрыняты своечасова меры супроць фашыстаў, арганізаваўшых у цішы змову супроць народу.

Можна не сумнявацца ў тым, што Гітлер і Мусаліні, генералы Франко і Мола, фашысты ва Францыі і ў іншых краінах, усе заклятыя ворагі адзінства рабочага класа і народнага фронту, усе ворагі дэмакратыі, соцыялізма і Совецкага Саюза будуць вітаць гэты ганебны акт, бо выступленне Сітрына—Адлера накіравана да ўзмацнення расколу ў радах сусветнага рабочага руху, яно лье ваду на млын міжнароднай рэакцыі.

Было-б няправільна ўскладаць адказнасць за гэта выступленне на ўсе партыі і арганізацыі, уваходзячыя ў Соцыялістычны Інтэрнацыянал і Міжнароднае аб'яднанне профсаюзаў. Несумненна, яны не давалі мандата Сітрыну і Шэвенельсу, Дэ-Брукеру і Адлеру выступаць на абарону Троцкага, Зіноўева, Каменева, арганізаваўшых тэрарыстычныя акты супроць кіраўнікоў вялікай краіны Советаў. Яны ім не давалі мандата абараняць падсудных — саюзнікаў германскага фашызма і агентаў Гестапо. Яны не даручалі гэтым лідэрам скарыстаць працэс над тэрарыстычнай бандай для новай паклёпніцкай кампаніі супроць Совецкага Саюза і для зрыву адзінага фронту супроць фашызма.

На долю мільёнаў прыхільнікаў адзінства ў радах Соцыялістычнага Інтэрнацыянала і Міжнароднага аб'яднання профсаюзаў зараз, у сувязі з ганебным выступленнем Сітрына і іншых, выпадае яшчэ большы абавязак даць адпор сабатажнікам адзінага фронту. Даўно пара пакласці канец іх выступленням ад імя рабочых арганізацый, выступленням, якія перашкаджаюць адзінай барацьбе супроць агульнага ворага.

На прыкладзе асуджаных вырадкаў кожны можа бачыць, як рэнегаты, двурушнікі, што іграюць радыкальнай фразай, накшталт Троцкага, выступаюць у ролі шкоднікаў у радах рабочага руху і выконваюць зладзейскую справу фашызма. Цяпер нават самыя блізарукія людзі могуць бачыць наколькі патрэбна Троцкаму стварэнне «IV Інтэрнацыянала» і каму служыць гэты брудны зброд ашалелых дробнабуржуазных індывідуалістаў, самаўлюбёных кар'ерыстаў, агентаў Гестапо і іншых паліцэйскіх ахранак.

Умець праяўляць зоркую класавую пільнасць на кожным кроку, навучыцца адрозніваць сапраўдных друзей ад скрытых ворагаў, выкрываць двурушнікаў, агентаў класавага ворага, своечасова і бязлітасна выганяць іх з радоў пролетарскіх арганізацый — такі адзін з важнейшых урокаў працэсу для рабочага руху ўсіх краін.

Мы не сумняваемся ў тым, што ўсе арганізацыі рабочага класа дадуць заслужаны адпор антысовецкім выбрыкам Сітрыных і будуць мацаваць і развіваць рух адзінага фронту, згуртоўваць мільёны рабочых вакол справядлівай нацыянальнай вайны іспанскага народу супроць мяцежных генералаў, падтрымліваемых італьянскімі і германскімі фашыстамі, згуртоўваць рабочы клас супроць агентаў фашызма — трацкісцкіх змоўшчыкаў.

(«ПРАВДА»).

СВАВОЛЬСТВА ДЫРЭКТАРА

(Пісьмо рабочага)

У арцелі інвалідаў № 4 (Менск) я працаваў з 1934 года. Наш цэх, які вырабляў саргавыя шчоткі, складаўся выключна са сляпых. Жылі мы ўсе ў інтэрнаце арцелі.

У гэтым годзе Беларускае таварыства сляпых накіравала шасцярых з нас на шчотачную фабрыку імя Крупскай. Адразу-ж дырэктар арцелі Грудзінскі адняў у нас пасцельныя прылады і прапанаваў выехаць з інтэрнату. Як-раз у гэты час я забалеў і быў накіраван у больніцу, дзе мне зрабілі аперацыю правага бядра. Выпісаўшыся праз месяц з больніцы, я даведаўся, што ў інтэрнаце маю койку забралі.

Зараз я з хворай нагою валяюся абы дзе. Няўжо нас, сляпых, па загаду Грудзінскага можна беспакарана выкідаць на вуліцу?

Я. Л. СІЛІНГ.

УСЁ ЯШЧЭ «ВЫЯСНЯЮЦЬ»

З 24 чэрвеня па 5 лістапада 1935 года я загадвала дзіцячымі яслямі ў калгасе «2 большэвіцкая вясна», Алесаўскага сельсовета, Полацкага раёна. Згодна прынятага на сябе калгасам абавязацельства, я рэгулярна штомесяц павінна была атрымліваць заработную плату. Аднак за ўвесь час маёй работы мне выплацілі толькі 50 рублёў. Пры заканчэнні-ж працы калгас адмовіўся зрабіць канчатковы разлік.

Я абскардзіла ў нарсуд. Апошні маю справу доўга не разглядаў. На маё запытанне, калі-ж нарэшце будзе разгледжана, мне адказалі, што «паслалі на выясненне, калі выяснім — паведамім». Не дачакаўшыся паведамлення, я зноў звярнулася ў нарсуд. На гэты раз у судзе мне прапанавалі самой паехаць у калгас і дабіцца разліку. А туды я ўжо ездзіла не адзін раз і ўсё без вынікаў.

Звярнулася я і да пракурора, той кажа, што гэта справа суда.

Уся гэта цяганіна прадаўжаецца амаль год, а атрымаць запрацаванае я дагэтуль не магу.

Н. Ф. КУПЧАНКА.

ДЗЕЦІ БЕЗ ДОГЛЯДУ

У соўгасе «Доктаравічы», Капыльскага раёна, дзеці рабочых па цэлых днях бываюць без догляду. Большую частку часу іх можна ўбачыць каля аўтамашын, на якія яны часта чапляюцца і «пад'язджаюць». У выніку такой безнагляднасці 29 ліпеня папаў пад аўтамабіль 9-гадовы хлопчык рабочага Кіені, якому колам пераламала нагу.

ДОКІН.

СВЕЖЫЯ ГАЗЕТЫ ІДУЦЬ У МАКУЛАТУРУ

Каб больш атрымліваць прэміяльных за продаж газет, загадчык розніцы Гомельскага аддзялення Саюздруку Рабкін дазволіў кіёскам оптавы продаж. Аб гэтым я яшчэ у мінулым годзе пісаў у сваю цэхавую газету пры паштовай канторы. Але ні рабачком, ні сакратар партарганізацыі на мой сігнал не звярнулі ўвагі. І зараз пад непасрэдным кіраўніцтвам Рабкіна паміж кіёскамі ідзе неафіцыяльнае «спаборніцтва» на аптовы продаж. Справа даходзіць нават да таго, што свежаатрыманыя газеты прадаюцца оптам на макулатуру.

ЗАХАРЫН.

УСЕНАРОДНАЕ АБМЕРКАВАННЕ ПРАЕКТУ КАНСТЫТУЦЫІ СССР

Словы калгаснікаў

СВЯЦІЛАВІЧЫ. Пасля дзеннай працы ў канцылярыі Якшынскага сельсовета, Свяцілавіцкага раёна сабраліся старыкі-калгаснікі. Завязалася шчырая размова па поваду праекта сталінскай Канстытуцыі. Размову пачаў 84-гадовы Іван Сямёнавіч Рыжанкоў — калгаснік сельскагаспадарчай арцелі «Перамога».

— Новы сталінскі закон, — звярачаецца ён да калгаснікаў, — гэта клопаты роднага правадыра народаў таварыша Сталіна і совецкага ўрада аб нас, старыках. Цёмнае мінулае згінула, яно ніколі не вернецца. Добра папрацуеш у калгасе, дык добра заробіш. Асабіста я жыву заможна: удосталь хлеба, сала. Маю карову, двое цялят, аднаго кабана забіў і двое яшчэ адкармліваю. Па новай Канстытуцыі мая старасць матэрыяльна забяспечана. Я ні ў чым не адчуваю патрэбы.

Са слязьмі на вачах аб мінулым праклятым жыцці ўспамінае 80-гадовы калгаснік Васілій Савельевіч Баранаў.

— Калісьці я служыў у старой царскай арміі, — гаворыць ён. — Памятаю, як сёння, я садзіўся вярхом на каня: конь быў натурлівы, кідаўся на дыбы, ято я пачаў трымаць за повад. Вахмістар крычыць мне: «Сукін сын, кідай повад». Я гавару: «Ніяк не, пан вахмістр». Ён тады падскочыў да мяне і ні завошта нагайкай рассек мне спіну да крыві. І цяпер відаць яшчэ сляды нагайкі. Ды хіба-ж гэта адзіны выпадак. Не заўважыш міма праходзячага афіцэра, пасадзяць на гаубвахту. Фельдфебель кулакамі саб'е. Хапіла гора.

А цяпер як-жа мне не радавацца, калі мае дзеці сталі людзьмі. Сын Грыгорый — камандзір Чырвонай арміі. Іван — дырэктар вагонабудаўнічага завода ў Днепрапетроўску. Васілій — вучыцца на лётчыка, быў тры гады членам урада БССР. Осіп — піонерработнік, комсамолец. Я асабіста атрымліваю штомесяц пэнсію ў размеры 100 рублёў, як інвалід, пацярпеўшы ад белапалякаў.

Са сваімі сынамі я перапісваюся. Аднойчы Васілій прыслаў мне радаснае пісьмо, што ён быў на X з'ездзе комсамола, бачыў вялікага Сталіна. Хіба-ж мог я і мае дзеці марыць аб гэтым. Дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае і радаснае жыццё, — заканчвае ён сваю гутарку.

Да позняй ночы калгаснікі-старыкі вялі шчырую гутарку аб новай сталінскай Канстытуцыі: у кожнага з іх гучэла жаданне выказаць падзяку творцу Канстытуцыі — правадыру і настаўніку таварышу Сталіну.

П. ЯЗЕРСКІ.

Гэта магчыма толькі ў нашай цудоўнай краіне

— Сумна прайшла мая маладосць, — так успамінае мой 65-гадовы бацька аб жабрацкім, цёмным мінулым. — 10 год ад самай ранняй вясны і да глыбокай восені я пасвіў кароў. Узімку хадзіў працаваць да пана, папа, каб зарабіць кусок хлеба.

Цяпер наша сям'я жыве заможна. Маё юнацтва самае раднае і шчаслівае. З малых год я пашоў вучыцца. Сёлета скончыў газетны комуністычны тэхнікум. Як выдатніка-студэнта газетны тэхнікум мяне паслаў на экскурсію Масква—Ленінград. Колькі шчасця і радасці я меў на гэтай экскурсіі.

— Гэта магчыма, — гаворыць мне цяпер бацька, — толькі ў нашай цудоўнай краіне, якой кіруе родны наш таварыш Сталін.

Цяпер мая мара — стаць лётчыкам. Фізічна я моцны. У барацьбе за інтарэсы 170-мільённага народу, за інтарэсы партыі Леніна—Сталіна я не пашкадую жыцця.

Я і мой бацька ад усёй душы шлём шчырую падзяку дарагому Сталіну.

МІКОЛА СТАРАСЦІН.

г. Сянно.

Дадаткі і заўвагі працоўных

(З пісем, паступаючых у рэдакцыю)

Да артыкула 132 праекта сталінскай Канстытуцыі мы прапануем унесці наступны дадатак: У Чырвоную Армію дапусціць прыём добраахвотнікаў незалежна ад узросту.

Сцяпан КУХАРАЎ, Адам ЧАРНОЎ, Сцяпан МІРОНАЎ.

Чырвонапольскі раён.



На заводзе «Чырвоны металіст» імя Кірава (Віцебск) арганізаван новы цэх шырспажыву, які прыступіў да выпуску дзіцячых санак, дзіцячых веласіпедаў і іншых вырабаў. На здымку: справа начальнік цэха т. Газарх І. Е. глядзіць за якасцю выпускаемай прадукцыі, злева рабочы тав. Ронін.

Фото Каплінскага.

НІ ПАДРУЧНІКАЎ, НІ СШЫТКАЎ

— Дайце, калі ласка, мне чытанку для 3-га класа.

— Няма.

— А падручнік арыфметыкі?

— Няма.

— А сшыткі ёсць?

— Няма.

Такая размова адбылася паміж вучаніцай Каранкевіч Надзяй і прадаўцом ларка БАКТА ў м. Кіраўску Майсеевым.

Не адна Надзя атрымлівае такі адказ. У Кіраўскім ларку БАКТА можна знайсці пару дзюжын алоўкаў, некалькі бутэлек чарніл і груду непатрэбных кніжак. Але ні тут, ні ў крамах райспажыўсаюза нічога няма да пачатку навучальнага года.

Старшыня райспажыўсаюза **Фельдман** заяўляе што «аб гандлі падручнікамі і школьнымі прыладамі няма яшчэ ўказанняў з Менска».

Вучням Кіраўскага раёна прыходзіцца ездзіць за 20—30 клм. у Бабруйск, каб купіць падручнік або сшытак.

М. ЯРЧАК.

„Прадаваць сшыткі—забаронена“

У грэскай кнігарні сшыткаў хапае. Але купіць іх—справа не лёгкая. Усе сшыткі павязаны ў пачкі, і кожны пачак замацован за школай. Вучань, які атрымаў работу на лета, не мае магчымасці яе падрыхтаваць: бо раней пачатку навучальнага года ён нідзе не дастане сшытка.

Загадчык кнігарні **Драбушэвіч** стаў на шлях яўнага парушэння пастановы партыі і ўрада аб гандлі школьнымі прыладамі. Калі хто з вучняў прыдзе да яго або да прадаўца Кудзелькі і спытае ці ёсць сшыткі, то яны груба адказваюць:

— Прадаваць сшыткі — забаронена.

— А як адносна скуплі старых падручнікаў? — пытаюць кліенты.

— Наконт скуплі старых падручнікаў у нас няма ўказанняў, — заяўляюць Драбушэвіч і Кудзелька.

Гэтае парушэнне пастановы партыі і ўрада аб гандлі школьнымі прыладамі ў Грэску не сустракае прасячэння і з боку раённых кіруючых арганізацый.

В. АСТРОЎСКІ.

У Свяцілавічах правалілі каштоўнае мерапрыемства

У цэнтры Свяцілавіцкага раёна на 16 жніўня быў назначан школьны базар. На базар прыехала шмат калгаснікаў раёна, школьнікі, настаўнікі.

У краму Свяцілавіцкага сельпо зайшла група пакупнікоў.

— Скажыце, падручнікі ёсць, сшыткі, алоўкі? — звярачаюцца да крамніка Рахубы.

— Няма нічога.

Падручнікі, сшыткі, алоўкі на суму 35 тысяч рублёў ляжаць у Гомелі і Ветцы. А райспажыўсаюз іх не прывозіць.

На базары не было ні аднаго падручніка і сшытка. Базар не арганізаван. Свяцілавіцкае сельпо замест вучэбных прылад прывезла на базар некалькі... бочак рыбы! Яе прадавалі з аднаго прылаўка. Калі адзін з калгаснікаў заўважыў, што так нельга гандляваць, дык старшыня сельпо Кавалёў, п'яны, ледзь стоячы на нагах, пачаў лаяць калгаснікаў.

Арганізатар базару — старшыня райспажыўсаюза Кобрынец хадзіў па базару і спакойна назіраў за гэтымі агіднасцямі.

Е—кі.

Безагаворачна выконваць закон аб аліментах

(Агляд пісем)

У рэдакцыю паступаюць дзесяткі пісем — скаргі аб злосным ухіленні бацькоў ад выплаты аліментаў на выхаванне сваіх дзяцей. Ёсць яшчэ і такія бацькі, якія, каб пазбегнуць адказнасці, проста ўцякаюць, пераязджаюць з горада ў горад, з раёна ў раён і г. д.

— Мой былы муж Сенько Есіп — піша калгасніца калгаса «Рассвет», Хойніцкага раёна, Мележ Вольга Сцяпанаўна, — пакінуў мяне з малым сынам Хведарам ужо вельмі даўно. Пасля гэтага некаторы час ён працаваў у Менску. Дзе ён цяпер — не ведаю. Прашу рэдакцыю дапамагчы мне расшукаць майго былога мужа, каб атрымаць аліменты.

— Пражываю ў вёсцы Рыскава, Курганскага сельсовета, Журавіцкага раёна — піша Кавалёва Ганна. — Мой былы муж Завялаў Мікалай Мікалаевіч пражыў са мной тры гады і кінуў мяне тады, калі я была цяжарнай. Цяпер майму сыну 7 месяцаў. Мне вельмі цяжка выхоўваць яго — сродкаў няма. Завялаў недзе хаваецца. Калі хто ведае, прашу паведаміць яго адрас.

Такіх пісем з просьбай расшукаць ухіліўшыхся ад аліментаў бацькоў у рэдакцыю паступае вельмі многа. Органы міліцыі не праяўляюць дастатковай энергіі ў расшуках бацькоў, якія ўхіліліся ад аліментаў. Нямала і такіх фактаў, калі дзеці і маці расшукваюць на працягу некалькіх гадоў ухіліўшагася ад выплаты аліментаў бацьку, але вынікаў не маюць.

Вось што піша калгасніца калгаса «Рэволюцыя», Дарасінскага сельсовета, Слуцкага раёна, Галоўчыц Ганна Дзмітраўна:

— За Іванова Іосіфа Петрова я вышла замуж у 1932 г. Пражылі мы з ім паўтара гады ў калгасе «Рэволюцыя», потым ён мяне пакінуў і з'ехаў. Маю ад яго дзіцё, якому ўжо тры гады. Прашу знайсці Іванова, бо ён нічога не плоціць на ўтрыманне дзіцяці. У Слуцкую раённую міліцыю і народны суд я ўжо хадзіла 11 разоў. Мяне ўсе супакойваюць «знойдзем, знойдзем», але я думаю, што за два гады ўжо можна было знайсці...

Работніца соўгаса «Вопытнае поле», Менскага раёна, Сцефаковіч Анастасія Емельянаўна пытае: «Хто знойдзе бацьку-нягодніка».

І сапраўды, Анастасіі Емельянавай прыходзіцца расшукваць нягодніка.

У Кастрычніку 1934 года яна працавала ў соўгасе «Анаполь», Менскага раёна, разам з Тарасавым Паўлам, за якога і вышла замуж. У ліпені 1935 года, Тарасаў кідае цяжарную жонку, крадзе ў яе грошы, бацінкі, коўдру і іншыя рэчы і ўцякае ў Менск. Вельмі хутка Тарасаў апынуўся на станцыі Калодзішчы, у другі раз «знаходзіць» жонку. Цяпер Сцефановіч зноў згубіла след Тарасава. І ў міліцыю, і ў суд, і ў пракуратуру — куды толькі не звярталася Сцефановіч, але... бацька-нягоднік дзесьці спакойна пражывае і, можа, думае наконт чарговай «жаніцьбы».

Але не толькі аб тых, каго прыходзіцца расшукваць ідзе гутарка. Нямала такіх фактаў, калі аліменты не спаганяюцца хаця і ёсць з каго спагнаць. Пракуратура і судовыя органы многіх раёнаў задавальняюцца толькі тым, што прысуджаюць аліменты. Як-жа яны спаганяюцца — гэтым менш усяго цікавяцца. Некаторыя судвыканаўцы праяўляюць злачынную бяздзейнасць.

— У 1930 годзе, — піша Чаранкоў Владзімір Сафронавіч, — бацька наш — Сафрон Іванавіч пакінуў матку і нас, дваіх дзяцей. Дубровенскі народны суд прысудзіў у нашу карысць 40 руб. у месяц. Выканаўчы ліст мы перадалі судвыканаўцу па Аршанскаму раёну Гаранскаму яшчэ ў пачатку 1936 года. Да судвыканаўца я звярачаўся некалькі разоў, але атрымаў дзіўны адказ: «Цябе бацька грошы высылае». Я цвёрда настайваю, што гэта хлусня, а судвыканаўца і слухаць не хоча. Тады я паскардзіўся нарсуддзю. Суддзя на выканаўца «пакрычаў» і... зноў няма вынікаў. Я рашыў звярнуцца да пракурора, але і з гэтага нічога не атрымалася. Так праходзяць гады і ніяк не можам дабіцца выканання рашэння суда.

Аб гэтых-жа скардзіцца Балотнікава Соф'я Іванаўна. У яе ад былога мужа — Цярэшчанка Сямёна Кастусёва двухгадовая дзяўчынка. Цярэшчанка заплаціў прысуджаныя аліменты толькі за два месяцы ў 1935 годзе, а больш не плоціць; Балотнікавай-жа ніяк не ўдаецца прымусіць яго плаціць далей.

Таксама безрэзультатна абівае парогі судовых органаў Рабкова Хрысціна Ісакаўна з Дубровенскага раёна, якой яшчэ ў 1932 годзе нарсуд Дубровенскага раёна прысудзіў аліменты ад грамадзяніна Світкі Сяргея С. на ўтрыманне дзіцяці.

Нядаўна прынятая ЦВК і СНК Саюза ССР пастанова аб забароне абортаў, спецыяльным пунктам павысіла крымінальную адказнасць за ўхіленне ад уплаты прысуджаных судом сродкаў на ўтрыманне дзяцей. За такое злачынства законам прадбачана пакаранне да двух год турэмнага заключэння. Гэты закон, як і многія іншыя законы пролетарскай дзяржавы, прадыктаваны сталінскімі клопатамі нашай партыі і ўраду аб совецкай сям'і, аб выхаванні дзяцей нашай шчаслівай радзімы. Закон гэты павінен быць выканан цвёрда і безагаворачна. Сям'я, дзеці ў Совецкім Саюзе акружаны клопатамі. І тыя пасобныя людзі, якія ўхіляюцца ад выканання сваіх прамых абавязкаў перад сям'ёй, павінны не толькі сустрэць асуджэнне совецкай грамадскасці, але і быць прыцягнуты да суровай адказнасці. Судова-следчым органам варта гэта цвёрда памятаць.

НАПЯРЭДАДНІ ГАДАВІНЫ СТАХАНАЎСКАГА РУХУ

МАГІЛЕЎ. 25 жніўня. Калектыў абутковай арцелі «1 мая» абавязаўся да гадавіны стаханаўскага руху поўнасцю асвоіць новыя нормы і датэрмінова выканаць гадавы план выпуску прадукцыі. Абавязацельствы члены арцелі выконваюць з гонарам. У арцелі цяпер няма ні аднаго рабочага, які не выконваў-бы новых норм. 25 стаханаўцаў штодзенна новыя нормы выконваюць на 140—160 проц. Стаханаўцы-загатоўшчыкі Ванілер, Коган выконваюць нормы на 165 і больш процантаў.

Ударная работа забяспечыла арцелі выкананне на 20 жніўня гадавога плана на 85 проц. Рабочыя абавязаліся выканаць гадавы план да 1 кастрычніка і даць звыш плана прадукцыі на 400 тыс. рублёў.

***

БАБРУЙСК. 25 жніўня. Рыхтуючыся да гадавіны стаханаўскага руху, рабочыя цагельнага завода № 4 абавязаліся да 1 верасня выканаць гадавую праграму па выпуску цэглы-сырцу. Гэта сваё абавязацельства рабочыя з гонарам выканалі. Гадавы план па выпуску цэглы-сырцу выканан. На 25 жніўня завод вырабіў 5.200 тыс. цаглін.

(БЕЛТА).

***

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»).

У парадку сустрэчы стаханаўскай гадавіны на варштатабудаўнічым заводзе імя Кірава праводзіцца вялікая работа па праверцы выканання соцдагавораў, узятых па спаборніцтву трох гарадоў. Аднačасова ў цэхах працуюць брыгады па праверцы ходу рэалізацыі тэхнічных мерапрыемстваў, выпрацаваных заводскімі арганізацыямі з мэтай лепшага асваення новых норм.

Гэтымі днямі на заводзе скліканецца канферэнцыя ўдарнікаў. У сувязі з гэтым у цэхах праводзіцца падрыхтоўчая работа: учот ударнікаў, гутаркі з мэтай аказання неабходнай дапамогі ў рабоце ўдарнікаў.

Асабліва ажыўлена праходзіць ў цэхах барацьба за заваяванне права быць занесеным у заводскую кнігу гонару, што выпускаецца заводскімі арганізацыямі да стаханаўскай гадавіны. Першай умовай для занясення ў кнігу гонару з'яўляецца стаханаўская работа. Ужо зараз многія стаханаўцы даюць рэкордную выпрацоўку. Кавалі Шацілаў, Небылоў выконваюць сваю норму выпрацоўкі першы на 327 процантаў і другі — на 299 проц; фармоўшчык Драздоў — 200 проц. З кожным днём множацца рады стаханаўцаў, якія даюць рэкордную выпрацоўку.

На швэйным гіганце, фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі», шырыцца рух двухсотніц. Следам за ініцыятарам гэтага руху стаханаўкай касцюмнага цэха Мартынавай Лёляй пайшлі яе таварышы па цэху: Карначова, Мураўёва, Абрамаў, Бумаў і інш. Усе яны выконваюць сваю новую норму на 200 і больш процантаў.

Двухсотніцы і двухсотнікі ёсць таксама ў ватным цэху. Гэта тт. Лабко, Владзімірава, Шэранкова, Ілінец і інш. Як у касцюмным, так і ў ватным цэхах двухсотніцы ўзялі шэфства над ударнікамі, абучаюць іх стаханаўскім метадам работы. Шырока асвятляе работу двухсотніц фабрычная шматтыражка.

У апошні дзень на фабрыцы асабліва павялічылася колькасць рацыяналізатарскіх прапаноў рабочых па перабудове тэхналагічных працэсаў на радзе вытворчых участкаў. Рэалізацыя гэтых прапаноў дасць магчымасць хутчэй асвоіць новыя нормы і палепшыць якасць прадукцыі.

ЗАРУБЕЖНЫ.

ВЫДАТНЫ ГОД

Прайшоў год стаханаўскай работы. Год, багаты такімі выдатнымі падзеямі ў жыцці нашай краіны, у жыцці кожнага з нас. Пачын Алексея Стаханава ўскалыхнуў мільённыя масы.

Для нас, работнікаў, ленінградскі зацяжчык Сметанін стаў сімвалам барацьбы за высокую стаханаўскую прадукцыйнасць працы. Мой першы рэкорд у 1300 пар абутку за змену быў падхоплен на іншых участках фабрыкі.

Лік стаханаўцаў рос з дня ў дзень.

У першыя дні разгортвання стаханаўскага руху нас было ўсяго 2—3 чалавекі, а зараз у нашым калектыве іх сотні. І зусім недалёк той дзень, калі ўся фабрыка стане суцэльна стаханаўскай.

Арганізаваная намі першая скразная стаханаўская брыгада дасягнула добрых рэзультатаў. Пры норме ў 1500 пар за змену мы выпускаем 1700—1800.

У 1935 годзе наша фабрыка ледзь выконвала план, а зараз мы падыходзім да выканання фактычнага выпуску абутку, намечанага на 1937 год.

Высокай прадукцыйнасці працы я дабіўся ў першую чаргу добрым асваеннем свайго працэсу. Мая абцяжная машына па сваей канструкцыі самая старая на фабрыцы, але-ж яе прадукцыйнасць большая за ўсіх. Нават аблягчоныя поўаўтаматы не могуць параўнацца з ёй. Я люблю сваю машыну і адчуваю малейшыя дыханні яе механізмаў, калі можна так сказаць.

Стаханаўская работа паступова ўнядрыла новую культуру на вытворчасці. Зусім іншымі сталі адносіны людзей да машын, да рабочага месца. Раней цяжка было прайсці па цэху. На кожным кроку былі раскіданы загатоўкі, поўфабрыкат. Рабочыя звыкаліся з брудам. Зараз гэтага не ўбачыш. Для калодак зроблены паасобныя скрыні, канвеер убіраецца некалькі раз за змену, падлогу афарбавалі.

Стаханаўская праца патрабуе і стаханаўскай культуры!

Вырас я і сам. Быў-жа я амаль што малапісьменным, нідзе не вучыўся. Ніякага разумення не меў аб такіх дысцыплінах, як алгебра, геаметрыя, геаграфія. Зараз да мяне ходзяць на-дом настаўнікі. Я паспяхова займаюся і асвайваю новыя дысцыпліны з такой-жа напорыстасцю, як і свой працэс. Рыхтуюся да паступлення ў промакадэмію.

Нядаўна звярнуўся з курорта. Пасля добрага адпачынку я з новымі сіламі прыступіў да працы. Да гадавіны стаханаўскага руху я рыхтуюся стаць двухсотнікам. Гэтымі днямі я ўжо дасягнуў вырабу 1800 пар.

У гэтую ўрачыстую гадавіну вялікага стаханаўскага руху я шлю праклянцце подлым забойцам, тэрарыстам з трацкісцка-зіноўеўскага цэнтра, якія прабавалі пасягнуць на жыццё самага любімага правадыра народаў таварыша Сталіна, які даў усім нам новае шчаслівае жыццё.

Г. Н. СКАБЛО.

Стаханавец абутковай фабрыкі Імя Кагановіча

ВЫЖЫВАЮЦЬ СТАХАНАЎЦА З БУДОЎЛІ

Будуецца вялікі аршанскі ільнокамбінат. Гэта будзе чацверты па велічыні, буйнейшы ільнозавод совецкай краіны. З кожным днём усё вышэй і вышэй узнімаюцца сцены карпусоў, з кожным днём набліжаецца час сканчэння будоўлі. Шмат карпусоў камбіната ўжо ўступілі ў строй.

Разам з рэдактарам шматтыражкі камбіната т. Касаткіным мы накіроўваемся да чатырохпавярховага корпуса, гучаць лябёдкі. Яны ўзнімаюць на чацверты паверх цэглу, вялікія каўшы з цэментнай жыжай.

На гэтым корпусе, — расказвае т. Касаткін, — працуе лепшы стаханавец рэкардсмен, вярней быў рэкардсмен т. Верховінін В. Раней ён даваў па 1200 проц. нормы. Аднойчы ён уклаў 9300 штук цэглы, за 4½ гадзіны), а цяпер Верховінін здаў тэмпы, ледзь норму выконвае, — сумна заканчвае Касаткін.

— Чаму-ж ён здаў тэмпы?

— А хто-ж яго ведае, напэўна разляніўся чалавек.

Мы знаходзім Верхавініна, які сядзіць і нервова дакурвае папяросу. Разам з ім і астатнія члены звяна. Яны таксама сядзяць без работы. Верхавінін накіроўваецца да рэдактара.

— Дакуль мяне будуць травіць? Працую на будоўлях з 1931 года, а такога яшчэ не было. Паставілі мяне штурхачом. Там, дзе недаробкі, непаладкі, мяне туды і ставяць. Цэлы дзень бегаю ад адной работы да другой.

— Сталага месца не маю. Ніхто на мяне і на маё звяно ніякай увагі не звяртае. Як хочаш, так і працуй. Вось ужо з абеда сядзім без работы. Усім падаюць матэрыял, а нам няма.

У той час, калі Верхавінін з астатнімі членамі звяна (4 чал укладвае за звяно 7.000 тыс. штук цэглы, ён 9 жніўня з-за непадачы матэрыялаў улажыў усяго 1.000 штук цэглы. На будоўлі няма ніякай сістэмы размеркавання матэрыялу па звеннях. Адно звяно забяспечваюць матэрыялам, другое не. Стаханаўца Верхавініна аблічваюць на будоўлі. З жніўня быў выпадак, калі ўсім рабочым аплацілі за кладку 1.000 цэглы па 7 руб. 20 кап., а Верхавініну ўсяго 5 руб. 60 кап.

Калі ён аб усіх гэтых абураючых фактах заявіў начальніку аб'екта т. Салавейчыку, то апошні яму груба адказаў.

— Не жадаеш працаваць! лодыра ганяеш.

Салавейчык наогул узяўся выжыць стаханаўца Верхавініна з будоўлі. Прапанаваны Верхавініным метад звеннявой работы на кладцы, які значна павялічвае прадукцыйнасць працы ўкладчыкаў, усякімі метадамі кампраметуецца.

Не спадабалася Салавейчыку і тое, што Верхавінін штодзенна яму ўказвае на цэлы рад агіднасцей, якія наглядаюцца на пабудове.

Справа дайшла да таго, што 8 жніўня Верхавінін падаў заяву аб звальненні яго з работы.

Ці не кажуць усе гэтыя факты аб яўнай траўлі перадавіка-стаханаўца?

Аб усім гэтым ведае начальнік будаўніцтва ільнокамбіната Авербух, сакратар парткома т. Баскін, Ведаюць і астатнія кіраўнікі будаўніцтва, але яны [illegible] і лічаць гэта дробяззю.

М. РОТМІЛЬ.

Ад рэдакцыі: Рэдакцыя чакае ад Аршанскага РК КП(б)Б неадкладнага рэагавання па сутнасці гэтага матэрыялу.

Цэх сельскагаспадарчых машын завода «Чырвоны металіст» імя Кірава (Віцебск) за ліпень месяц выканаў промфінплан на 115 проц. На здымку: стаханавец, прафорг гэтага-ж цэха тав. Садкевіч А. Я. промфінплан за ліпень выканаў на 400 проц.

Фото Каплінскага.

ПАЧЭСНАЯ СУСТРЭЧА

ГОМЕЛЬ. 25 жніўня. (Па тэлеграфу). Рыхтуючыся да гадавіны стаханаўскага руху, шклозавод імя Сталіна за апошнія дні жніўня выпускае штодзень па 26.945 метраў гатовай прадукцыі, пры плане ў 24.730 метраў. У паасобныя дні дасягаем 28 тысяч метраў. Даем 32 проц. першага гатунку, пры хуткасці ў 60 пагонных метраў па адзінарнаму шклу.

Стаханаўцы машынна-ваннага цэха **Мамянко, Панкоў, Шміт** і іншыя даюць да 2.000—2.200 лістоў. Стаханаўцы рэзнага цэха **Мухаморын, Савулеў** і інш. выразаюць 580 метраў шкла пры норме ў 400. 23 жніўня стаханавец **Шэўцоў** выразаў 625 метраў. За 10 дзён лік стаханаўцаў павялічыўся на 110 чалавек.

АДАМОВІЧ.

Дырэктар завода.

КУЛЬТУРНА АБСЛУГОЎВАЦЬ ПАСАЖЫРАЎ

Па віцебскаму вузлу скончыўся рэйд «лёгкай кавалерыі» па праверцы абслугоўвання пасажыраў.

З абураючымі фактамі сустрэліся «кавалерысты» на вакзале станцыі Віцебск.

Ад паяздоў застаюцца пасажыры — не хапае месц. Усе яны, у чаканні наступнага поезда, рассаджваюцца на прывакзальнай плошчы ля прыгараднай касы. Прыбіральшчык вакзала Мартыноўскі, не лічачыся з тым, што стаяць пасажыры, не пабрызгаўшы плошчу і не памачыўшы мятлу, падняў пыл.

Да касы папярэдняга продажу білетаў падышла работніца фабрыкі імя КІМ Стальмакова і запытала колькі каштуе білет да станцыі Ерома, Паўночнай чыгункі. Касірша Лебедзева вельмі груба адказала: «Я не ведаю, дзе гэта станцыя, што за станцыя і колькі каштуе білет, ды і наогул я не абавязана адказваць».

Папрабуйце папіць вады ў першым класе вакзала. Дарэмная справа. Ёсць усяго два графіны, але і яны ў большасці бываюць пустымі. Хаця пасажыраў мала, але-ж афіцыянтак прыходзіцца доўга чакаць.

Але ярчэй усяго твар бюракратаў вакзала выступае з старонак «Кнігі скарг». Чытаем. Цэлая серыя скарг. На некаторыя ёсць адказы — фармальна-бюракратычныя. На некаторыя-ж скаргі адказу зусім няма. Так і адчуваецца недапушчальна барскія адносіны да пасажыра, які, на думку кіраўнікоў буфета, усёроўна паедзе, чытаць адказу не будзе.

Пасажыр Кімстач скардзіцца на адсутнасць вады ў зале. Адказ на гэта такі: «На ўсіх сталах ставіць графіны нельга. сталы маленькія, два графіны ёсць».

Была заказана вячэра на восем чалавек. Пасажыры прачакалі гадзіну і 20 мінут, але вячэры не атрымалі. Дырэктар буфета тав. Ітыксон на гэту скаргу піша рэзалюцыю: «т. Раскіна, высветліць, хто вінаваты ў непадачы вячэры». Раскіна высвятляла на працягу цэлага месяца.

Намеснік дырэктара тав. Трэцякоў лічыць неабходным на скаргах надпісваць свае рэзалюцыі, але ён гэта робіць так, што ў выніку ні скаргі, ні яго «мудрыя» рашэнні разабраць нельга.

Пасажыр Ягораў дзве гадзіны чакаў падачы бутэлькі сітра. Пасажыр Аляксееў, паабедаўшы, не мог дачакацца афіцыянткі (Ліпнікава), каб разлічыцца, пакінуў на стале грошы і пашоў.

У буфеце 3-га класа няма чаю.

У тав. Ітыксона, дырэктара буфета, новы парадак — кнігу скарг даваць толькі ў тым выпадку, калі перш скажуць, аб чым будуць пісаць. Так, 6 жніўня электраманцёр поезда 47-48 Волкаў хацеў напісаць скаргу, што яму не адпусцілі абед са скідкай па маршруту, але яму Ітыксон заявіў: «Кніга скарг выдаецца ў тым выпадку, калі пасажыр скардзіцца на дрэннае абслугоўванне». Ітыксона ніяк не маглі пераканаць, што ён з сваёй «тэорыяй» не праў, што кнігу скарг ён абавязан даць незалежна ад таго, аб чым пасажыр будзе пісаць.

Брыгада «Л. К.»:
МІЛАЕВА, ЧАРНОЎ.

18 жніўня ў Маскву прыехаў на гастролі Дзяржаўны грузінскі тэатр імя Руставелі. На вакзале артыстаў сустракалі прадстаўнікі камітэта па справах мастацтва, саюза работнікаў мастацтваў і маскоўскіх тэатраў. На здымку: (справа налева) тт. Арлоўскі (кіраўнік тэатра), намеснік дырэктара тэатра Губунава, мастацкі кіраўнік тэатра Васадзе, дырэктар Малога тэатра Амаглобелі, крытык Юзоўскі і Чомахідзе. Фото Траяноўскага.

ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАУНАГА ТЭАТРА ГРУЗІІ У МАСКВЕ

МАСКВА, 26 жніўня. (БЕЛТА). Гастрольныя спектаклі Дзяржаўнага тэатра Грузіі імя Руставелі ў Маскве праходзяць з вялікім мастацкім поспехам. 23 і 24 жніўня тэатр паказаў музычную камэдыю Серго Клдзіяшвілі «Асеннія дваране» у пастаноўцы заслужанага дзеяча мастацтва К. Патарыдзе. Гэта п'еса, якая з'яўляецца яркай соцыяльнай сатырай на дваранскае грамадства Грузіі канца мінулага стагоддзя, таксама як і спектакль «Арсен», мела вялікі поспех і была цёпла прынята гледачамі.

Спектакль 24 жніўня наведалі сакратар ЦК ВКП(б), нарком шляхоў зносін тав. **Л. М. Каганович** і нарком цяжкай прамысловасці тав. **Серго Орджанікідзе.** Публіка, якая прысутнічала на спектаклі, убачыўшы таварышоў Кагановіча і Орджанікідзе, горача віталі іх бурнымі воплескамі. Па сканчэнні спектакля гледачы і трупа тэатра зноў наладзілі таварышам Кагановічу і Орджанікідзе доўгую авацыю.

Пасля спектакля калектыў тэатра імя Руставелі выканаў сваім гасцям «Песню аб Сталіне» заслужанага дзеяча мастацтва кампазітара І. Тускія, а таксама некалькі народных харавых песен. У час аднаго з антрактаў і па сканчэнні спектакля таварышы Каганович і Орджанікідзе гутарылі з калектывам тэатра аб творчых пытаннях.

Таварышы Каганович і Орджанікідзе жыва цікавіліся творчай работай тэатра, яго гастролямі ў Маскве і ўдзелам у надыходзячым чацвертым тэатральным фестывалі. Яны далі станоўчую ацэнку спектаклю «Асеннія дваране», адзначыўшы, у прыватнасці, яго вялікую музычнасць.

З АПОШНЯЙ ПОШТЫ

„РЭДАКЦЫЯ ЗАПРАШАЕ ДЛЯ ФАТАГРАФАВАННЯ"

Набліжаецца гадавіна стаханаўскага руху. Ва ўсіх рэдакцыях прывычная спешка. Зацвярджаюцца планы нумару. Літработнікі атрымліваюць заданні: на якое прадпрыемства ісці, з якімі стаханаўцамі гутарыць, які арганізаваць матэрыял. Рэдактар заказвае нарысы, артыкулы, падвалы. Фото-рэпарцёры бегаюць па фабрыках і заводах, фатаграфуюць лепшых людзей прамысловасці.

Толькі ў **адной** рэдакцыі пануе цішыня. Спакойна сядзяць работнікі гомельскай рэдакцыі газеты «Палеская праўда» на сваіх дубовых стулях, мерна і роўна скрыпяць пер'і, ні шуму, ні мітусні, ні беганіны. Рыб'я кроў цячэ ў жылах работнікаў «Палескай праўды».

Рэдактар тав. Бугроў аднак крыху занепакоіўся наконт святочнага нумару. Нядоўга думаў вынаходлівы рэдактар. Пяццю радкамі ён замяніў цэлы апарат рэдакцыі і ўсю падрыхтоўку да гадавіны.

23 жніўня чытачы газеты са здзіўленнем прачыталі аб'яву аб тым, што рэдакцыя запрашае на 24 жніўня ў рэдакцыю рад таварышоў (пералічаны прозвішчы некалькіх стаханаўцаў Гомеля) **«для фатаграфавання і арганізацыі матэрыялу** да гадавіны стаханаўскага руху»... У аб'яве паказан і час яўкі: **«ад 10 да 12 гадзін раніцы, або ад 4 да 6 гадзін вечара».**

З такой аб'явай тав. Бугроў можа быць спакойны. Напэўна ў прызначаны дзень і час запрошаныя з'явіліся ў рэдакцыю, там фатаграфавалі і «арганізоўвалі» матэрыял... А можа яны і не з'явіліся да рэдакцыйных чыноўнікаў, якім няма часу самім пайсці на завод і там на месцы арганізаваць матэрыялы і рабіць фотаздымкі.

Дастойнае папаўненне Чырвонай арміі

Сталіца ордэнаноснай БССР дае ў гэтым годзе Чырвонай арміі добрае папаўненне. Ідуць на прызыў з энтузіязмам. Прызыўнікі заяўляюць, што не могуць дачакацца той мінуты, калі на іх будзе ўскладзен ганаровы абавязак грамадзян СССР— служыць у рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.

У раённы ваенны камісарыят паступіла таксама вялікая колькасць заяў ад маладых людзей нараджэння 1915 года з просьбай уключыць іх у тую палову кантынгенту, які будзе прызван у бягучым годзе разам з моладдзю 1914 года нараджэння.

Які-ж твар прызыўнікоў? Вялікі процант з іх—стаханаўцы фабрык і заводаў, многа значкістаў ГПА, варашылаўскіх стралкоў, парашутыстаў, лётчыкаў, планерыстаў, прайшоўшых падрыхтоўку без адрыву ад вытворчасці. Ні аднаго непісьменнага. Малапісьменнасць ліквідавана на 90 проц. Агульнаадукацыйны ўзровень на многа вышэй, чым пры леташнім прызыбе.

Сярод прызыўнікоў можна бачыць удзельнікаў лыжнага пераходу Менск—Масква і ордэнаносцаў—рабочых швейнай фабрыкі «Кастрычнік», зрабіўшых пераход у супрацьіпрытных касцюмах Менск—Масква.

Нядаўна праведзеная гарадская спартакіяда прызыўнікоў паказала прыкметны рост сярод іх фізічнай культуры і добрае здароўе прызыўнікоў.

У даны момант менскі райваенкамат узмоцнена рыхтуецца да праваджэння самога прызыву, які пачнецца 5 верасня. Упрыгожваюцца памяшканні прызыўных пунктаў, укамплектаваны прызыўныя камісіі. На многіх фабрыках і заводах праходзяць сходы, прысвечаныя прызыву ў Чырвоную армію.

ШКОЛЫ МЕНСКАГА РАЁНА ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

У гэтым годзе ў сельсоветах Менскага раёна пабудаваны тры новыя вялікія школы. На 280 дзяцей пабудаван двухпавярховы каменны будынак школы ў Красным урочышчы, Прыгараднага сельсовета. Закончана будаўніцтва аднапавярховага будынка школы ў Ждановічах на 160 вучняў. Капітальны бягучы рамонт праведзен сёлета ў 95 сельскіх школах. Арцель «Комунар», Смалявіцкага раёна вырабіла для школ Менскага раёна 1.500 новых парт, 50 кніжных шафаў і т. д. У наступаючым навучальным годзе ў сельскіх школах раёна будзе навучацца звыш 13.000 дзяцей.

НОВЫЯ РАБОТЫ БАЛОТНАГА ІНСТЫТУТА

Прэзідыум усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя Леніна зацвердзіў папярэдні план работы ўсесаюзнага навукова-даследчага інстытута балотнай гаспадаркі ў Менску на 1937 год. Інстытут будзе працаваць над 27 тэмамі, прысвечанымі агратэхніцы зернавых, кармавых і тэхнічных культур на балоце, а таксама гідратэхніцы і меліярацыі. Апрача таго інстытут падрыхтуе для ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі карту балот СССР. Работа над гэтай картай вядзецца ўзмоцненымі тэмпамі. У 1937 годзе інстытут закладзе ў 275 калгасах Саюза вопыты з мэтай атрымання высокіх ураджаяў на былых балотах.

УСЕСАЮЗНЫ ЗЛЕТ СТАХАНАЎЦАЎ ЗАПАЛКАВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

30 жніўня ў Рэчыцы на запалкавай фабрыцы «Х Октябр» склікаецца ўсесаюзны злёт стаханаўцаў запалкавай прамысловасці, прысвечаны гадавіне стаханаўскага руху. Злёт абмяркуе пытанне далейшага разгортвання стаханаўскіх метадаў работы.

У ДАПАМОГУ ВЫНАХОДЦАМ

На радзе буйнейшых прадпрыемстваў рэспублікі абсталяваны спецыяльныя цэхі, майстэрні і лабараторыі для эксперыментавання вынаходніцтваў і рацыяналізатарскіх прапаноў рабочых. На менскім заводзе імя Варашылава абсталяван цэх для патрэб вынаходцаў. Цэх мае ўсё неабходнае абсталяванне, якое дае магчымасць вынаходцу і рацыяналізатару вырабіць самыя складаныя дэталі. На магілеўскай шаўковай фабрыцы абсталявана эксперыментальная лабараторыя.

Коратка

✱ Ваданосны гарызонт прэснай вады адкрыт у Магілеве ў часе буравых работ. Скважына два разы фантаніравала. У апошні раз напор вады ў трубах дасягнуў 21 метра вышэй паверхні зямлі. Гэтае адкрыццё будзе мець вялікае значэнне для паляпшэння вадаснабжэння Магілёва.

✱ Новы клуб адкрыўся пры Крупскай МТС. У ім абсталяваны глядзельная зала, чытальня, пакой гульняў і бібліятэка. Побач з клубам арганізаван спартыўны гарадок.

✱ Новая лазня, прапускной здольнасцю на 150 чалавек у гадзіну, пачала будавацца ў Менску па Доўгабродскай вуліцы. На будаўніцтва лазні адпушчана звыш 800 тысяч рублёў. Будынак лазні будзе двухпавярховы.

24 жніўня ў Маскве на Тушынскім аэрадроме Цэнтральнага аэраклуба СССР адбылося авіяцыйнае свята, прысвечанае Дню авіяцыі. На здымку: лётчыквысотнік т. Кокінакі пасля дэманстрацыі складаных фігур вышэйшага пілатажу на свяце.
Фото Еўзерыхіна (Саюзфото).

Школьны базар ў Віцебску

У парадку сустрэчы новага навучальнага года на плошчы «Дынамо» ў цэнтры горада Віцебска адкрыўся вялікі школьны базар. К паслугам школьнікаў ёсць вялікі выбар падручнікаў і школьна-канцылярскіх прылад, а таксама абутак і адзенне.

ПАДАРУНКІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ПАДШЭФНЫМ ШКОЛАМ

ВІЦЕБСК, 26 жніўня. (БЕЛТА). Па ініцыятыве комсамольскіх арганізацый рад прадпрыемстваў горада рыхтуе падарункі вучням падшэфных школ. Інструментальна-мэблевая фабрыка для падшэфнай 37-й школы рыхтуе столікі, некалькі камплектаў шахматаў, більярды, абсталяванне для фоталабараторыі. Завод «Чырвоны металіст» імя Кірава абсталёўвае ў 9-й падшэфнай школе механічную майстэрню. Шчаціна-шчотачны камбінат для вучняў 28-й школы закупляе спорт-інвентар. Комсамольцы сувязі праводзяць радыё.

ГАНДЛЁВАЯ ХРОНІКА

✱ Цэны на раннюю бульбу зніжаны з 25 жніўня. У Менску, Віцебску і Гомелі адзін кілограм бульбы каштуе 35 кап., у астатніх гарадах і раёнах 30 кап.

✱ На асеннія яблыкі і грушы ўраджаю 1936 г. для Менска і Віцебска ўстаноўлены наступныя цэны: на яблыкі вышэйшага, першага другога і трэцяга гатункаў, адпавед на — 1 р. 50 к., 1 р. 40 к., 1 р. 20 кап. і 1 руб. за кілограм. Яблыкі «Штрэйфлінг» і «Апорт» вышэйшага, першага і другога гатункаў каштуюць 2 руб., 1 р. 80 к., і 1 р. 60 к. кілограм. На грушы цэны застаюцца ранейшыя.

Па гарадах і раёнах БССР

✱ У рабочага гомельскага завода «Пралетарый» імя Кірава тав. Эпштэйна з 1906 года захавалася кніга «Евгений Онегин» — Пушкіна размерам у 17Х25 міліметраў і таўшчынёю ў 4 міліметры,—у чатыры разы менш каробкі запалак. У кнізе 234 старонкі. Яна захоўваецца ў спецыяльным бронзавым футляры. Кніга была выдана ў Варшаве ў 1899 годзе выдавецтвам М. Шульца **(«Палеская праўда»).**

✱ На свінаферме калгаса «Барацьбіт», Аршанскага раёна, свінаматка дацкай пароды за чатыры апаросы дала 52 парасят. У гэтым годзе яна апарасілася два разы. Першы раз—9 парасят і другі раз—20 жніўня — 20 парасят. Усе парасяты захаваны і знаходзяцца пад штодзенным наглядам загадчыка фермы Шарая і ветэрынарнага фельчара. **(«Ленінскі прызыў»).**

✱ Чашніцкі радыёвузел устанавіў у хатах калгаснікаў арцелі «Чырвоная слабада» 20 радыёкропак. Калгаснікі слухаюць у часе адпачынку радыёперадачы з Масквы і Менска **(«Калгасная праўда»).**

✱ Новы гукавы кінотэатр імя Будзённага адкрыўся ў Жлобіне. У першы дзень работы тэатра дэманстраваўся фільм «Цырк».

ДЫНАМАЎЦЫ ЗАВАЯВАЛІ КУБАК БССР

24 жніўня на ўсебеларускім стадыёне адбыўся фінал розыгрышу футбольнага кубка БССР, паміж камандамі спартыўных таварыстваў «Дынамо» і «Спартак». Матч скончыўся перамогай дынамаўцаў з лікам 3:1. Пераможцам быў тут-жа ўручан кубак.

Абедзве каманды ігралі вельмі груба. Не гледзячы на неадаразовыя заявы ў друку аб грубасцях і хуліганстве на футбольным полі, Беларускі камітэт па справах фізкультуры і спорту, кіраўніцтвы таварыстваў «Дынамо» і «Спартак» ніякіх вывадаў для сябе не зрабілі, нічога не прадпрымаюць па выхаванню футбалістаў, не ачышчаюць рады фізкультурнікаў ад п'яніц, хуліганаў і грубіянаў.

Тэатральная хроніка

✱ Трэці Беларускі дзяржаўны тэатр аднавіў сваю работу ў Гомелі. У асенне-зімовым сезоне тэатр пакажа прэм'еру «Сям'я Волкавых» у пастаноўцы мастацкага кіраўніка тэатра Саннікава, «Мікола Гоман»— Сташэўскага і «Чырвоныя прамені» — народнага артыста рэспублікі Галубка. З ранейшых пастановак у рэпертуар уключаны п'есы «Сержант Дроб», «Часовщик и курица» і «История пяти хвостов».

✱ Беларускі тэатр юнага гледача нядаўна закончыў паездку па піонерскіх лагерах рэспублікі, а таксама па раёнах Мазырскай акругі. Тэатр абслужыў 48 лагераў. Новы сезон тэатра адкрыецца ў Менску 15 верасня. З 1 лістапада калектыў тэатра паедзе на двухмесячную вучобу ў студыі пры тэатры імя Вахтангава ў Маскве.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Парткалегія пры упаўнаважаным КПК па БССР просіць з'явіцца ў ПК (Менск, Чырвонаармейская, 16, 3 паверх, пакой № 26) 27 жніўня г. г. у 10 гадзін раніцы т. Бакунова Фёдара Міхайлавіча (б. студэнт ВКСГШБ) і Любімава Аляксея Зіноўевіча.

Просьба да ўсіх устаноў і арганізацый, якія ведаюць месцазнаходжанне памянёных таварышоў, паведаміць у ПК.

Парткалегія пры ўп. КПК па БССР.

⁂

Ніжэйпаіменаваныя ў спісу, выключаныя з партыі ў час праверкі партдакументаў, былыя члены і кандыдаты партыі, выклікаюцца да 1 верасня 1936 года ў Сталінскі РК КП(б)Б г. Менска для гутаркі па пададзеных імі апеляцыях.

Кантаровіч Іосіф Вульфавіч, **Карых** Грыгорый Лейбавіч, **Карабыка** Давід Андрэевіч, **Карміна-Бяпецкая** Ксенія Фёдараўна, **Картажынскі** Хаім Абрамавіч, **Катушонак** Зіновій Пятровіч, **Кайко** Нікалай Фёдаравіч, **Казлоўскі** Аляксандр Дзімітравіч, **Колба** Ульян Фадзеевіч, **Конін** Канстанцін Міхайлавіч, **Карабок** Вульф Меeравіч, **Краснік** Аляксандр Іванавіч, **Куртатскі** Іван Антонавіч, **Куркоў** Аляксей Міхайлавіч, **Лявіцкая** Браніслава Казіміраўна, **Лядоўскі** Антон Міхайлавіч, **Макоўская** Зося, **Манькіна** Геня Файвушэўна, **Мачайла** Аляксандр Матвеевіч, **Мачальскі** Владзімір Сцяпанавіч, **Маншыкоў** Павел Васільевіч, **Міхнавец** Іван Ефімавіч, **Мішчанка** Н. Е., **Мікуцкі** Антон Антонавіч, **Млодзінава** Бася Лейбаўна, **Мудрагелеў** Грыгорый Грыгор'евіч, **Несцюк** Нікалай Нікалаевіч, **Нісенбаум** Зелік Беркаў, **Новікаў** Васілій Афанасевіч, **Палоўчанка Анна** Іванаўна, **Пачэўскі** Генрых Янавіч, **Песін** Гырш Аронавіч, **Пляцкі** Франц Іванавіч, **Падбярозны** Аляксандр Нікалаевіч, **Пакроўскі** Міхаіл Васільевіч, **Пчыцкая** Аляксандра Фадзееўна, **Ракіцкі** Владзімір Канстанцінавіч, **Райхлін** Ошэр Лейбавіч, **Рудзейненка** Іван Грыгор'евіч, **Седачоў** Аляксей Нікалаевіч, **Сабяшчук** Ануфры Іванавіч, **Сарокін** Сцяпан Гаўрылавіч, **Ткачоў** Еўгеній Васільевіч, **Тэценкоў** Аляксей Лукіч, **Усцілка** В. Д., **Федарончык** Захар Сцяпанавіч, **Фейгіна** Двося Самуйлаўна, **Фінкельберг** Соф'я Грыгор'еўна, **Флейшэр** Густаў Густавіч, **Фрыц** Грыгорый Сямёнавіч, **Хількевіч** Валенціна Паўлаўна, **Ціпкіна** Роза Наумаўна, **Чэрапан** Іосіф Фёдаравіч, **Чарнушэвіч** Залман Давідавіч, **Шамес** Залман Давідавіч, **Шарок** Якаў Фёдаравіч, **Шварэб** Даніл Раманавіч, **Швейдэль** Леб-Шлема Хаімавіч, **Шыраеў** Віктар Анатолевіч, **Шычко** Марыя Нікітаўна, **Шульман** Іосіф Ільіч, **Якаўлеў** Антон, Якаўлевіч, **Ячнік** Філіп Максімавіч.

Сакратар Сталінскага РК КП(б)Б г. Менска Н. ЛІТВІН

Ч. в. а. адказнага рэдактара
А. П. ДЖЭЛЮК.

Памяшканне БДТ-1
Гастролі 2-га Беларускага дзяржаўнага тэатра
СЁННЯ
В. Кіршон
ЦУДОЎНЫ СПЛАЎ
Пачатак у 8 гадзін вечара.

ДЗЯРЖЦЫРК
(сад „Профінтэрн", тэл. 25-085 і 24-171)
Сёння
вялікае цыркавое прадстаўленне
ў 3-х аддзяленнях.
Пачатак у 9 г веч

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНОТЭАТР — НОВЫЕ ВРЕМЕНА
„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — ШУКАЛЬНІКІ ШЧАСЦЯ
„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — ЦЫРК
„СПАРТАК" — КНЯЖНА МЭРЫ

ЗГУБЛЕНЫЯ І ЎКРАДЗЕНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНЫМІ

Рымша В. І. — пашпарт, студ. пасведчанне; Дуброўскі І. К. — прафбілет; Барысёнак М. К. — пасведчанне аб сканчэнні 6 класаў; Чхоўскі А. Т.— пасведчанне аб сканчэнні сямігодкі; Яначкін М. В. — пашпарт, ваенны білет; Багдановіч А. В. — пашпарт; Рыбчын А. П. — правы шофера, пасведчанне шофера, прафбілет; Міхневіч С. В. — пропуск завода імя Варашылава; Малахоўскі В. Ф. — ваенны білет; Паведайка С. М. — ваенны білет: Куракевіч А. С. — пашпарт № 076206, ваенны білет; Паўлюц С. І.— абавязацельства аб здачы мяса; Падабед І. Л. — пашпарт; Гутпайт Л. Д.— дыплом Бел. с.-г. акадэміі; Гендэльман Т. І. — пашпарт; Скуратовіч Е. К. — пропуск Менскай газетна-паштовай канторы; Верхавенц К. К. — пашпарт № 139558; Сівец О. Ф. — комсамольскі білет № 4965951, пашпарт; Гарлінскі Н. В. — метрыка; Саламонаў З. Д. — пашпарт; Крутлікаў А. В. — пашпарт; Напрушкін І. Т. пасведчанне асобы; Кучар А. Е. — ваенны білет; Чвялёў І. А. — пашпарт № 5158650, ваенны білет; Жаранкоў В. Г. — пашпарт 103646, правы шофера; Бурак С. М.— пашпарт; Дзедок О. А. — пашпарт № 166327; Навуменка Н. П. — ваенны білет; Стрыжэўская А. І. — пропуск фабрыкі «Кастрычнік»; Шапіра А. Я.— пашпарт; Круглікаў А. С. — даведка аб атрыманні пашпарта; Вайнфорс Ф. В. — членскі білет Саюза Совецкіх пісьменнікаў № 1530; Лысёнак А. І. — пашпарт; Чвялёў І. А. — прафбілет, камандзіровачнае пасведчанне; Скавырка А. І. — пашпарт ФЗ № 051850.

Тыраж 86.770 экз.

СКОРА! На экране гукавога кінотэатра „ПРОЛЕТАРЫЙ" СКОРА!
новая гукавая камедыя вытворчасці Белдзяржкіно 1936 г.

„ДЕВУШКА СПЕШИТ на СВИДАНИЕ"
Сцэнарый А. ЗОРЫЧА.
Рэжысер М. ВЕРНЕР.

Белкантора акцыянернага таварыства
„КРЭДЫТБЮРО"
вядзе справы ЗА ГРАНІЦАЙ
па атрыманню спадчыны, па рэалізацыі нерухомай маемасці, па атрыманню банкаўскіх укладаў, заграпічных каштоўных папер, па рэалізацыі прэтэнзій да асоб і арганізацый, якія знаходзяцца за граніцай, у тым ліку і да КУЧ.
Выплата кліентам праводзіцца па ўстаноўленаму спецкурсу на падставе пастановы СНК: за 3 франкі — 1 руб. з адпаведным пералікам для іншых інвалют: напрыклад: 1 далар — 5 р. 05 к. і т. д.
Белкантора акц. т-ва «Крэдыт-бюро» напамінае ўсім грамадзянам аб выданых у некаторых краінах спецыяльных законах, па якіх совецкія грамадзяне, якія не прад'яўляюць ва ўстаноўленыя тэрміны свае правы на маемасць, якая ёсць у іх у вышэйпаказаных краінах, пазбаўляюцца права на гэту маемасць.
Наш адрас: г. Менск, Белкантора акц. т-ва «Крэдыт-бюро», памяшканне Дзяржбанка.
Можна звяртацца таксама ва ўсе канторы і аддзяленні Дзяржбанка на месцах.

Смілавіцкі паляводчы тэхнікум абвяшчае, што ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ на 1-шы КУРС працягнут да 30 жніўня.

Тэхнікум рыхтуе спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі — аграномаў-паляводаў.
Умовы прыёму надрукаваны ў газеце «Звязда» № 185 ад 14 жніўня.
Адрас: п/а Смілавічы, БССР, паляводчы тэхнікум.
Маршрут паездкі: Менск, а з Менска аўтобусам да м. Смілавічы.
ДЫРЭКЦЫЯ.

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ павышэння кваліфікацыі і завочнага навучання спецыялістаў сельскай гаспадаркі праводзіць АСЕННІ ПРЫЁМ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ для навучання без адрыву ад вытворчасці.

1) **На факультэты ВНУ: а)** зоатэхнічны: б) агранамічны.

2) **На завочныя 6-месячныя курсы павышэння кваліфікацыі:** а) зоатэхнікаў з вышэйшай і сярэдняй асветай; б) аграномаў-паляводаў з вышэйшай і сярэдняй асветай.

З запросамі аб паступленні звяртацца ў Райза і МТС, а таксама ў завочнае аддзяленне. **Прыём заяў да 1 кастрычніка 1936 года.** Чырвонаармейцы прымаюцца бясплатна.

Да заявы трэба прыкласці паштовых марак на 40 кап. для адказу.

Адрас: **БССР, г. Горкі, Завочнае аддзяленне пры сельскагаспадарчым інстытуце.**

ДЫРЭКЦЫЯ.

Беларускі дзяржаўны медыцынскі інстытут даводзіць да ведама СТУДЭНТАЎ-ВЫПУСКНІКОЎ ТРЭЦЯЙ СЕСІІ, што ЗДАЧА ДЗЯРЖАЎНЫХ ІСПЫТАЎ пачнецца 1 КАСТРЫЧНІКА.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Друкарня газеты «Звязда», Менск, Савецкая, 63.

Менскі гарадскі камітэт комсамола і ГарАНА працягваюць НАБОР вучняў

у няпоўныя і поўныя вячэрнія агульнаадукацыйныя і сярэдне-тэхнічныя школы, якія арганізуюцца пры прадпрыемствах і размяшчаюцца ў наступных памяшканнях:

Заводы імя Кірава і Варашылава — 2-я школа, вул. Энгельса, 33.
Фабрыка імя Крупскай — 7-я школа, Комсамольская, 40.
Завод імя Молатава — Польпедтэхнікум, Совецкая, 144.
Фабрыка «Комунарка» — 5-я школа, Ленінская, 24.
Фабрыка «Кастрычнік» — Вышэйшы педінстытут.
Фабрыкі імя Кагановіча, Тэльмана і Куйбышава — 25-я школа, Совецкая, 44.
Школа агульнаадукацыйная чыгуначнікаў — 38-я школа, вул. Фабрыцыуса, 23.
Школа агульнаадукацыйная руская — 8-я школа, вул. Энгельса, 8.
Школа агульнаадукацыйная беларуская — 20-я школа, вул. Свярдлова.
Школа агульнаадукацыйная яўрэйская — 10-я школа, вул. Герцэна, 4.

Прыёмныя іспыты пачынаюцца з 27 жніўня ва ўсе школы і класы, згодна праграмных патрабаванняў звычайнай няпоўнай і поўнай сярэдняй школы, кожны дзень па ўсіх дысцыплінах, за выключэннем агульнавыходных дзён.

Для паступлення ў школу неабходна прадставіць наступныя дакументы: заяву, даведку або атэстат аб асвеце, метрыку і даведку аб месцы работы.

Увага. Вучні, маючыя на руках пасведчанні ці атэстат, прымаюцца ў наступны клас без іспытаў.

Заняткі ў школе пачнуцца 1 верасня 1936 г.

Рэгістрацыя — да 1 верасня будзе праводзіцца пры фабкомах.

МЕНГАРКОМ ЛКСМБ.
МЕНГАРАНА.

УМОВЫ ПРЫЁМУ
ў дактарантскую аспірантуру Акадэміі навук БССР

1. Аспірантура акадэміі навук БССР ставіць сваёй мэтай падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў навуковых работнікаў для кіруючай даследчай работы ў інстытутах Акадэміі навук БССР, а таксама для іншых навуковых устаноў БССР.

2. Асноўнай задачай аспіранта-дактаранта Акадэміі навук БССР з'яўляецца ўдасканаленне сваёй навуковай спецыяльнасці і падрыхтоўка доктарскай дысертацыі. У сваёй працы аспірант-дактарант атрымлівае сістэматычную кансультацыю акадэмікаў, а таксама адпаведных спецыялістаў.

3. У аспіранты-дактаранты прымаюцца асобы, якія актыўна ўдзельнічаюць у соцыялістычным будаўніцтве, паспяхова скончылі аспірантуру ВНУ і атрымалі вучоную ступень кандыдата навук, або асобы, якія не прайшлі аспірантуру, але маюць веды ва ўказаным аб'ёме і абаранілі дысертацыю на вучоную ступень кандыдата навук. Асобы паступаючыя ў аспірантуру, павінны ведаць дзве замежныя мовы.

4. Прыём у аспіранты-дактаранты Акадэміі навук БССР будзе праводзіцца па наступных спецыяльнасцях:

Літаратура	1 чал.	**Эканоміка**	2 чал.
Мова	1 »	**Геалогія**	2 »
Філасофія	1 »	**Торф**	1 »
Права	1 »	**Біялогія**	1 »

5. Паступаючыя ў аспірантуру павінны прайсці іспыты па выбіраемай спецыяльнасці і дыялектычнаму і гістарычнаму матэрыялізму.

6. Тэрмін навучання ў аспірантуры — 3 гады.

7. Аспіранты-дактаранты забяспечваюцца стыпендыяй 350—400 руб. у месяц, а таксама жылплошчай (сем'і прынятых у аспірантуру жылплошчай не забяспечваюцца).

8. За ўсімі даведкамі звяртацца ў аддзел падрыхтоўкі навукова-даследчых кадраў — г. Менск, Ленінская, 29/35, пакой 31.

Там-жа прымаюцца заявы.

Дырэкцыя аддзела падрыхтоўкі навукова-даследчых кадраў АН БССР.

НАРКАМХАРЧПРОМ СССР
Беларуская кантора „Саюзрыбзбыт"
(г. Менск, Інтэрнацыянальная, 6)
мае ў сваіх базах, магазінах і ларках у гарадах БССР— Менску, Гомелі, Віцебску, Бабруйску, Магілеве, Оршы —
РЫБА
вялікі асартымент рознай РЫБЫ:
свежай, капчонай, паравой, салёнай, марынаванай, розныя высокаякасныя балыкі і вялікі асартымент рыбных кансерваў.
Праводзіцца таксама продаж кулінарных вырабаў уласнай кухні

Уп. Галоўлітбела № К—273.